Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

КАСТРЫЧНІК 11 1932 г. № 228 (4480)

Год выдаўня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

СЛАЎНЫМ ГЕРОЯМ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА

КІЧКАС. Начальніку Дняпроўскага будаўніцтва **Вінтэру**, *сакратару райпарткому* **Лейбензону**, *старшыні райкому саюзу будаўнікоў* **Броўка.**

На жаль, не маю выканаць вашу просьбу наконт прыезду на пуск Днепрастанцыі, з прычыны немагчымасьці адлучыцца з Масквы па ўмовах работы.

Гарачае прывітаньне і віншаваньне рабочаму калектыву і кіруючаму складу Днепрабуду ў сувязі з пасьпяховым завяршэньнем вялікага гістарычнага будаўніцтва.

Моцна цісну руку ўдарнікам Днепрабуду, слаўным героям сацыялістычнага будаўніцтва.

І. Сталін.

ПРЫВІТАНЬНЕ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ УсеКП(б) І СНК СССР

КІЧКАС.

НАЧАЛЬНІКУ ДНЯПРОЎСКАГА БУДАЎНІЦТВА — ВІНТЭРУ, САКРАТАРУ ПАРТКОМУ — ЛЕЙБЭНЗОНУ, СТАРШЫНІ БУДКОМУ — БРОЎКА.

ЦК УсеКП(б) І СНК САЮЗУ ССР ГОРАЧА ВІТАЮЦЬ РАБОЧЫХ І РАБОТНІЦ, ІН ЖЫНЭРАЎ, ТЭХНІКАЎ І ЎВЕСЬ КІРУЮЧЫ СКЛАД ДНЕПРАБУДУ.

ВІНШУЕМ ВАС, ТАВАРЫШЫ, З ЗАВЯРШЭНЬНЕМ БУДАЎНІЦТВА І ДАТЭРМІНОВЫМ ПУСКАМ ГІГАНТА ЭЛЕКТРЫФІКАЦЫІ, ЯКІ НЯ МАЕ САБЕ РОЎНЫХ У СЬВЕЦЕ.

КАЛІ ГЭТУ ЗАДАЧУ ГІГАНЦКАГА БУДАЎНІЦТВА ЎДАЛОСЯ ВЫРАШЫЦЬ САВЕЦКАЙ УЛАДЗЕ Ў КАРОТКІ ТЭРМІН, У МОМАНТ, КАЛІ ВА ЎСІМ КАПІТАЛІСТЫЧНЫМ СЬВЕЦЕ ЛЮТУЮЦЬ РУЙНУЮЧЫ КРЫЗІС І БЕСПРАЦОЎЕ, ТО ГЭТА МАГЛО АДБЫЦЦА ТОЛЬКІ ТАМУ, ШТО ЎЛАДА САВЕТАЎ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА АДЗІНАЙ УЛАДАЙ У СЬВЕЦЕ, ЯКАЯ МАЕ САМААХВЯРНАЕ ПАДТРЫМАНЬНЕ МІЛЬЁНАЎ РАБОЧЫХ І СЯЛЯН.

НЯХАЙ ЖЫВЕ РАБОЧАЯ КЛЯСА!
НЯХАЙ ЖЫВЕ ЎЛАДА САВЕТАЎ!
НЯХАЙ ЖЫВЕ ЛЕНІНСКАЯ ПАРТЫЯ!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ УсеКП(б).
САВЕТ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ СССР.

ПРЫВІТАНЬНЕ ЦВК БССР

Пэ́ззыдыум ЦВК БССР горача вітае працоўных Савецкай Украіны з новай вялікай перамогай у барацьбе за генэральную лінію партыі, у барацьбе за сацыялізм — з пускам Днепрабуду.

За Днепрабуд змагаліся і перамаглі пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК і правадыра партыі і рабочай клясы т. Сталіна рабочыя і працоўныя ўсяго Савецкага саюзу, умацаваўшы яшчэ больш у гэтай барацьбе інтэрнацыянальнае адзінства сваіх радоў.

Пуск Днепрабуду ёсьць новая перамога ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Шлях Днепрабуду — шлях да перамогі камунізму.

Няхай жыве камуністычная партыя і яе ленінскі ЦК на чале з т. Сталіным!

Няхай жывуць будаўнікі Днепрабуду!

Няхай жывуць рабочыя, калгаснікі і ўсе працоўныя Савецкай Украіны і Савецкага саюзу!

Старшыня ЦВК БССР ЧАРВЯКОЎ.
За сакратара ЦВК БССР ЛЯЎКОЎ.

Здаць дзяржаве 2.352 тоны мяса баявая задача сьвінасаўгасаў БССР

Паўгода таму назад партыя і ўрад у вядомай пастанове аб рабоце жывёлагадоўчых саўгасаў з усёй рашучасьцю ўскрылі асноўныя недахопы ў будаўніцтве буйных жывёлагадоўчых гаспадарак. ЦК і СНК ускрылі безгаспадарчасьць і безадказнасьць, якія былі праяўлены радам работнікаў жывёлагадоўчай сыстэмы, і вызначылі канкрэтныя шляхі перабудовы і ўмацаваньня саўгаснай вытворчасьці.

Прашоўшы 6 месяцаў былі пераломнымі ў жыцьці і рабоце саўгасаў. Асноўныя ўказаньні партыі і ўраду аб разбуйненьні жывёлагадоўчых гаспадарак і арганізацыі форм з поўным зваротам стада няўхільна праводзяцца ў жыцьцё. Фэрма зараз становіцца асноўнай гаспадарчай адзінкай у саўгасе. Кіраўніцтва набліжана непасрэдна да вытворчасьці. Так, напрыклад, замест аднаго трэсту Сьвінавод, у БССР арганізаваны тры — Менскі, Аршанскі і Магілеўскі. Замест ранейшых 86 сьвінагадоўчых саўгасаў, зараз арганізавана 136. Разбуйнен і Малакапрамтрэст.

Зьлёт лепшых старшых сьвінароў-ударнікаў, які нядаўна адбыўся ў Менску, паказаў, што там, дзе праводзяцца ў жыцьцё пастановы партыі і ўраду, якія зьяўляюцца ўвасабленьнем 6 умоў тав. Сталіна, там мы маем бліскучыя вынікі. Арганізацыя фэрм і сьвінарнікаў-камбінатаў са скончаным зваротам стада стварае выключна спрыяючыя ўмовы для паляпшэньня якасьці работы. Аб гэтым сьведчаць вынікі 3-месячнай работы фэрм саўгасу «Вішнёўка», саўгасу «Беларусь», «Зарэчча». Гэтыя фэрмы, сапраўды ліквідаваўшы абязьлічку на сьвінарніку, дабіліся выхаваньня апаросаў.

Выкананьне 6 умоў т. Сталіна сьвянілася магутным вагаром для далейшага разьвіцця і росту жывёлагадоўчых саўгасаў.

Аднак, нельга сказаць, што жывёлагадоўчыя саўгасы канчаткова аздароўлены. Перш за ўсё аб гэтым гаворыць надзвычай вялікі процант падзяжу маладняка, асабліва парасят. Возьмем Менскі трэст «Сьвінавод». Адыход парасят на 20 верасьня па трэсьце дасягае 38 проц. Ёсьць саўгасы, як **«Новыя Зялёнкі», «Велень», імя Сталіна**, дзе загінула ад 39 да 56 проц. парасят. У радзе гаспадарак дагэтуль не навучыліся падлічваць пагалоўе. Як паведамляе нам кантралёр Наркамзему тав. **Буртэль**, у саўгасе **«Старчыцы»** (Слуцкі раён) нядаўна пры праверцы не хапала 62 сьвіньні. Загадчык фэрмы і зоатэхнік прабавалі ўтаіць недахват парасят і папоўніць яго за лік новага прыплоду. Падзёж парасят за тры кварталы ў «Старчыцах» дасягае да 44,3 проц. У саўгасе **«Боркі-Бялевічы»** пры праверцы не хапала 135 шт. маладняка. Зоатэхнік **Шорнікаў**, які фактычна адказвае за становішча сьвінагадоўлі, не правяраў наяўнасьці стада, а верыў іжывым лічбам, што давяліся тэхнічным персаналам саўгасу.

Саўгас **«Велень»** (Пухавіцкі раён) з 1½ тысячным стадам мае ўсе ўмовы для таго, каб стаць узорнай гаспадаркай. Але, як паведамляе брыгада рабкораў, тут да дырэктывы партыі і ўраду аб перабудове саўгаснай вытворчасьці, аднесьліся фармальна. Як і раней панове на фэрме ўраўнілаўка ў зарплаце, абязьлічка і цякучасьць рабочай сілы.

У сьвінарніках не хапае карыт, якія адміністрацыя ўсё лета «зьбіраецца» набыць. Да зімоўкі саўгас зусім не падрыхтаваны. У выніку злачыннай бязьдзейнасьці адміністрацыі ў саўгасе загінула 50 проц. парасят.

Зусім нездавальняюча пастаўлена ў саўгасах партыйна-масавая работа. Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі раду саўгасаў яшчэ не перабудавалі сваёй работы ў адпаведнасьці з новымі задачамі і падмяняюць канкрэтнае жывое кіраўніцтва паперовымі патокам розпаго роду агульных прапаноў, як «безадказна на ўсе 100 проц. ліквідаваць прарывы» і інш.

Вельмі меткую характарыстыку работы прафсаюзных арганізацый дала на зьлёце сьвінароў ударніца саўгасу імя Молатава тав. **Абухоўская.** На запытаньне, ці ёсьць у іх рабачком, Абухоўская адказала: «Рабачком ёсьць, але старшыня рабачкому за тры месяцы толькі адзін раз прышоў на фэрму і то запытаў, ці туды ён папаў».

Старшыня рабачкому ў саўгасе ня ведае фэрмы, ня ведае людзей, якія там працуюць і ўмоў іх работы. Такое становішча арганізацыйнай работы характэрна ня толькі для саўгасу імя Молатава. Партыйна-масавая работа яшчэ не перанесена непасрэдна на фэрму, у брыгаду.

Пастанова ЦВК СССР аб стварэньні народнага камісарыяту збожжавых і жывёлагадоўчых саўгасаў зьяўляецца новым далейшым крокам для паляпшэньня кіраўніцтва саўгасамі і яшчэ большага набліжэньня яго непасрэдна да саўгаснай вытворчасьці.

Дзьве галоўныя задачы, падкрэсьленыя ў дырэктывах партыі і ўраду ад 1-га красавіка, а іменна — здачы таварнай прадукцыі, захаваньня і росту пагалоўя і зараз стаць па ўсім абёме перад саўгасамі і трэстамі.

Апублікаваная 24 верасьня пастанова СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб мясазагатоўках накладвае на саўгасы яшчэ большую адказнасьць за паляпшэньне снабжэньня рабочых і ўсіх працоўных гораду, за безадкладную рэалізацыю дырэктыў партыі і ўраду аб перабудове саўгаснай вытворчасьці.

Аблягчаючы выкананьне пляну мясазагатовак сялянствам, пастанова разам з тым павялічвае плян здачы мяса саўгасам з 130 тыс. тон за мінулыя 15 месяцаў да 300 тыс. тон. Найбольшая колькасьць — 90 тыс. тон прыпадае на долю саўгасаў «Сьвінаводу». Выходзячы з гэтай пастановы, **сьвінагадоўчыя саўгасы БССР павінны на працягу чацьвертага кварталу здаць дзяржаве ня менш 2.352 тоны мяса**, у тым ліку саўгасы Менскага трэсту — 1.152 тоны, Аршанскага — 800 і Магілеўскага — 400 тон.

Пытаньне аб сваячасовай і поўнай здачы таварнай прадукцыі сьвінагадоўчымі саўгасамі ставіцца з ўсёй вострасьцю. Выканаць плян здачы мяса зусім рэальны. Выкананьне яго патрабуе ня гучных рэзалюцый і абяцаньняў, а сапраўднага ажыцьцяўленьня ўказаньняў партыі і ўраду аб перабудове работы саўгасаў, набліжэньня канкрэтнага кіраўніцтва як з боку адміністрацыі, так і партыйных і прафсаюзных арганізацый, да саўгасу, да фэрмы і брыгады, адказнасьці за даручаную справу, сапраўднага ўкараненьня ў саўгасную вытворчасьць 6 умоў тав. Сталіна.

Саўгасы зараз уступаюць у найбольш адказны пэрыяд — пераходу ад летняга ўтрыманьня жывёлы на выпасах да зімовага стойлавага ўтрыманьня. Задача дырэктыў саўгасаў — загадзя падрыхтаваць усе ўмовы для нармальнага ўтрыманьня жывёлы ў зімовы час, пачынаючы ад рамонту памяшканьняў і канчаючы забесьпячэньнем кармамі. Ужо з восені з агульна-саўгасных запасаў трэба вызначыць для кожнай фэрмы канцэнтраваныя грубыя і сакавітыя кармы. За захаваньне і мэтазгоднае скарыстаньне кармоў пароўні з дырэктыўнай саўгасу, адказвае і загадчык фэрмы.

Выкананьне пляну мясазагатовак высоўвае перад саўгасамі задачу павышэньня якасьці адкорму, шляхам надзяленьня адкормачнага стада на дробныя групы, адпаведна ўзросту, вазе і сытасьці. Кожная дарослая сьвіньня, якая здаецца дзяржаве, павінна важыць ня менш 136 кілр., а маладняк — ня менш 80 кілр. Середня-месячны прырост маладняка павінен быць ня менш 16 кілр.

Саюзны Наркамзем у сваёй дырэктыве аб паляпшэньні матар'яльна-бытавых умоў работнікаў саўгасаў падкрэсьлівае, што «рабочым, спэцыялістам і служачым саўгасаў трэба дазволіць мець для ўласных патрэб кароову, авечку, птушку, труса, а таксама вызначыць невялікія вучасткі для гародаў рабочых і служачых».

Да штомесячнай зарплаты сьвінароў і спэцыялістаў устанаўляецца шкала надбавак у залежнасьці ад тэрміну іх работы.

Пастанову партыі і ўраду аб мясазагатоўках, а таксама гэтыя дырэктывы НКЗ трэба давесьці да шырокіх мас работых саўгасаў.

Здаць дзяржаве 2.352 тоны мяса ў чацьвертым квартале — баявая задача сьвінагадоўчых саўгасаў БССР. Кіраўнікі сьвінасаўгасаў і ўся саўгасная грамадзкасьць павінны намагаць, якую адказнасьць яны вясуць перад партыяй і краінай за ажыцьцяўленьне гэтага пляну.

МТС павінны стаць кіраўнікамі калгасаў у галіне агранаміі

КІНУЦЬ УСЕ ТРАКТАРЫ НА ЗЯБЛІВА

Надышлі рашаючыя дні ў барацьбе за зяблева. Раньняя восень напамінае аб неабходнасьці скарыстаць літаральна кожны дзень для выкананьня вызначаных урадам плянаў. Нельга адкладваць на позьні час такую важнейшую гаспадарча-палітычную кампанію, ад якой залежыць ураджайнасьць 1933 году. Той, хто ігнаруе зяблева, робіць простае злачынства перад партыяй.

Згодна пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР («Зьвязда» ад 16 жніўня) трэба **«скончыць зяблева па ўсёй БССР да 20 кастрычніка».** Саўгасы павінны ўзараць 150 тыс. га, калгасы — 825 тыс. (у тым ліку калгасы МТС—335 тыс. га), аднаасобнікі 525 тыс. га — вось баявая праграма дзеяньня бліжэйшых дзён.

Аднак, існуючыя тэмпы ставяць выкананьне пляну зяблева пад простую пагрозу. На 5 кастрычніка зазяблева па БССР толькі 248 тыс. га (16,6 проц.) Пры чым МТС свой плян выканалі на 13,6 проц.

Ні чым іншым, як няўменьнем па-новаму працаваць, па-новаму кіраваць можна вытлумачыць ганебнае адставаньне машына-трактарных станцый. Куды варты той факт, калі з 50 МТС—20 зазяблілі менш 6 проц. да вызначанага ім пляну. Асаблівы «ўзор» паказваюць **Сіроцінская** МТС—0,7 проц., **Крупская** — 1,7 проц., **Цялуская** — 1,8 проц., **Асьвейская** — 2,7 проц.

Гэта сьведчыць перш за ўсё аб тым, што Белтрактарацэнтр і яго апарат **слаба** накладзілі спэрацыйнае кіраўніцтва МТС, свае часова **не падкягваюць** адстаючыя вучасткі, не пераносяць вопыт лепшых на ўсю БССР. Партарганізацыі на мясцох не аказваюць станцыям штодзённай дапамогі. Без мабілізацыі вакол работы МТС усёй пралетарскай і калгаснай грамадзкасьці, яны ня выйдуць на першую лінію ў выкананьні плянаў зяблева.

Дзе-ж прычыны адставаньня? Чаму МТС замест узорнай работы пацягнуцца ў хвосьце? Асноўная прычына крыецца ў тым, што ня ўсе трактары перакінуты на зяблева, а тыя што працуюць, ня выконваюць даданй ім нормы. Адбываюцца [illegible] стоі з-за частай палоўкі [illegible] якаснага ра[illegible]

мі. Няпоўнасьцю выкарыстоўваецца на зяблеве конская цягавая сіла.

Рэйд, які праводзіцца пад лёзунгам «піводнага бязьдзейнага трактару» ня даў належнага зруху. Партыйныя арганізацыі РКП РСІ, райгазэты зусім слаба змагаюцца за эфэктыўнае выкарыстаньне трактарнага парку на зяблеве і сяўбе.

Эфэктыўна скарыстаць кожны трактар можна толькі пры ўмовах ліквідацыі абязьлічкі, ураўнілаўкі ў аплаце працы, устанаўленьня пэрсанальнай адказнасьці за машыны. Кожны добра разумее, што не машыны, а жывыя людзі—трактарысты вырашаюць посьпех зяблева. Адсюль больш увагі, больш клопатаў аб трактарыстах.

Перад дырэкцыяй кожнай МТС і калгасамі паўстае задача — выканаць пастанову калегіі НКЗ СССР аб павышэньні ацэнкі работ трактарыста па 50 проц., сваячасова запісваць працадні, выдаваць натуральныя і грашовыя авансы, палепшыць грамадзкае харчаваньне, лепш забясьпечваць трактарыста вопраткай і абуткам.

Палепшыўшы матар'яльнае становішча трактарыстаў можна з большай упэўненасьцю патрабаваць ад іх адказнасьці за машыны, выкананьне норм выпрацоўкі, эка ночыі гаручага і змазачнага матар'ялу.

Час не чакае. Мабілізаваўшы ўсе калгасныя масы, усіх рабочых МТС, перакінуўшы ўвесь трактарны парк на ворыва, разгарнуўшы сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж брыгадамі і трактарыстамі, мы можам і павінны ў наступную пяцідзёўку **дабіцца рашаючага зруху** ў выкананьні плянаў зяблева.

Прыклад бальшавіцкай барацьбы за якасьць, за павышэньне ўраджайнасьці, за раньняе зяблева павінны паказаць МТС.

Хіжынкава агратэхніка ня цікавіць

СТАРОБІН. У сакратара райкому тав. **Хіжынкава** запыталі: «што робіцца па калгасах раёну ў напрамку ўкараненьня агратэхнікі»? Тав. **Хіжынкаў** доўга пя думаў. Ён адразу даў вычарпальны адказ: **«Зьвярнецеся да наступнага таварыша, а мне няма часу займацца гэтым пытаньнем».**

Даны факт ярка характарызуе тое, што нават адказныя раённыя партыйныя работнікі не ўсьвядомілі ўсёй важнасьці барацьбы за **цэнтральную задачу** сельскай гаспадаркі — за **павышэньне ўраджайнасьці.** Пытаньне агратэхнікі выпадае з-пад увагі штодзённай работы Старобінскага райкому КП(б)Б.

Яшчэ горш становішча ў зямельна-калгасных органах. Загадчык райза аб агразоатэхнічным паходзе, які абвешчан ЦК КП(б)Б яшчэ з 1 чэрвеня, і слухаць ня хоча. Па яго думцы, у раёне «ўсё добра». Аграном райза **Цімінскі** запэўняе, што па калгасах існуе 6 агратэхнічных гурткоў. Дзе, што яны робяць, — аб гэтым ні слова. Агранам-жа МТС тав. **Богуш** паогул забыўся, што абвешчан агразоатэхпаход.

«Ляваццкае» ігнараваньне агратэхнікі перадасьцца і па пэрыфэрыю. Кіраўнікі саўгасу **Капацэвічы (Сушко, Сыс, Восіпаў)** проста заяўляюць: «Наш саўгас жывёлагадоўчы, зямлі мала, дык навошта нам тыя гурткі па аўладаньні агратэхнікай». Зразумела, што пры такіх настроях ніколі не атрымаеш высокага ўраджаю.

Таму няма нічога дзіўнага, што вакол добраякаснай **апрацоўкі глебы,** правядзеньня раньняга зяблева не мабілізавана грамадзкая думка калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў.

Старобінская арганізацыя павінна ў бліжэйшыя-ж дні **пераключыць усю сваю работу ў напрамку ажыцьцяўленьня апошняй пастановы ЦК і СНК.** Лёзунг — за высокі ўраджай — павінен стаць дзейсным лёзунгам кожнага калгасу і саўгасу. **Піскун.**

Улічыць памылкі мінулага году

УВАРАВІЧЫ. (Наш кар.) У мінулым годзе шмат калгасаў і большая частка саўгасаў раёну сарвалі плян зяблева. Гэта знайшло свой адбітак у тым, што раён веснавую сяўбу запягнуў і скончыў яе са значным спазьненьнем.

Здавалася-б, што ўрок мінулага году павінен быў быць улічан райарганізацыяй. На справе-ж маем зусім адваротнае.

За ганебныя тэмпы ў выкананьні пляну зяблева раён зараз «Зьвяздой» занесен на чорную дошку, але райарганізацыя гэта, як відаць, мала трывожыць. Яны **ўсё-ж** працуюць па-старому.

Чаго варта такое становішча, калі плян зяблева па раёну на 5 кастрычніка выканан толькі на 8,4 проц. Калгасы раёну паводле пляну павінны зазяблець 6.030 гектараў. Гэты плян выканан на 3,9 проц. Выкананьне пляну аднаасобным сэктарам складае 11,3 проц.

Ня лепшае становішча наглядаем і у саўгасах. З 5 наяўных у раёне саўгасаў, да зяблева прыступіў толькі адзін саўгас Уваравічы, які ўзараў 25 проц. пляну. Астатнія-ж у гэтым напрамку абсалютна нічога ня робяць. Мала таго, калгасы 11 сельсаветаў не зазяблілі нават ні аднаго гектару.

Паданыя факты з усёй наглядпасьцю сьведчаць, што Уваравічы не разгарнулі належнай барацьбы за рэалізацыю пастаноў партыі аб павышэньні ўраджайнасьці сельскай гаспадаркі.

Час не чакае. Пара пакончыць з такой бязьдзейнасьцю. Перад райарганізацыямі стаіць неадкладная задача — мабілізаваць масы на ліквідацыю ганьбнага прарыву. Зьняць раён з чорнай дошкі — справа ўсёй грамадзкасьці раёну.

К.

Торф для подсьцілу

ЕЛЬСК. (Наш кар.). Калгас **«Шырокая ніва»** першы ў раёне адгукнуўся канкрэтнымі справамі на апошнюю пастанову ЦК і СНК «аб мерапрыемствах па павышэньні ўраджайнасьці».

[illegible] 1 кастрычніка поўнасьцю скончана [illegible] азімых. План выканан на 105 проц. [illegible]чана таксацыя і ўборка бульбы. Ужо зда[illegible] пралетарскім цэнтраў 2 тоны.

Для атрыманьня высокага ўраджаю патрэбна шмат гною. Калгас частку рабочай і цягавай сілы вылучыў на **загатоўку торфу для подсьцілу.** Астатняя частка калгасьнікаў перакінута на сканчэньне зяблева.

Калгас «Шырокая ніва» выклікаў на сяц спаборніцтва па пытаньнях лепшай барацьбы за павышэньне ўраджайнасьці калгасы **«Мытва» і імя Шаўчэнкі.** **Ельскі.**

КАСТРЫЧНІЦКІЯ СЬВЯТЫ СУСТРЭЦЬ ПОЎНЫМ ВЫКАНАНЬНЕМ ПЛЯНАЎ ПА АДГРУЗЦЫ БУЛЬБЫ ПРАЛЕТАРСКІМ ЦЭНТРАМ!

Месьніцкім тэндэнцыям—рашучы адпор!

Адгрузка бульбы для ЛВО ідзе вельмі марудна. З агульнага пляну 18.250 тон адгружана на 9 кастрычніка толькі 4.674 тон або 25,6 проц.

Неакторыя райзагі яўна зрываюць адгрузку. Напрыклад, Клічаўскі райзаг перахоплівае на перакрыкаваньні дарог фурманкі з бульбай, прызначаныя для здачы ЛВО, 25 верасьня такім чынам перахоплена 6 тон бульбы. На зробленую заўвагу тав. Таланцоў (старшыня райзагу) адказвае, што такое становішча ён лічыць «зусім нармальным». Райзаг да гэтага часу працягвае сваю злачынную дзейнасьць.

Клічаўская кантора Белплодагароднины бязьдзейнічае. У канторы пануюць настроі: «усё роўна да тэрміну ня выканаем плян адгрузкі і наогул няма чаго сьпяшацца, пасьпеем яшчэ».

Выпадкі перахвату бульбы раённымі арганізацыямі для сваіх патрэб мы маем і ў Слуцкім раёне. Прывезеную з Капыльскага раёну бульбу перахапіў мясцовы брозвар. РВК ніякіх мер супроць гэтага ня прымае.

Да гэтага часу пагляджаюцца з боку паасобных райзагаў нядбайныя адносіны да якасьці прадукцыі. Напрыклад, у Рагачоўскім раёне з патружаных 3-х вагонаў дзяржінскіцкый забракован адзін вагон, ужо падрыхтаваны для адпраўкі.

У шмат якіх мясцох адгрузка бульбы зрываецца з-за непадачы вагонаў па віне чыгуначнай адміністрацыі. У Дзяржынску 6 кастрычніка падан адзін вагон замест 6. 7 кастрычніка ў Рагачове падана тры вагоны замест 7. На 8 кастрычніка дана заяўка на 7 вагонаў, а дыспэтчар Жлобінскай станцыі даў толькі адзін вагон, астатняя бульба засталася непатружанай. Такія-ж зьявішчы наглядаюцца на станцыі Верайцы і ў Дуброўне.

У выніку такіх нядбайных адносін з боку чыгуначнай адміністрацыі бульба застаецца ляжаць пад адкрытым небам і прыходзіцца зноў наймаць рабочую сілу для патрузкі, у той час, як неабходна яе грузіць з вазоў проста ў вагоны.

Ня гледзячы на неадпаразовыя дырэктывы, даныя раёнам аб першачарговай адгрузцы бульбы ЛВО, да гэтага часу належнага пералому яшчэ няма. Такое становішча надалей нецярпіма. Вінаватыя ў зрыве адгрузкі павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

Тэрміны прайшлі, уборка ня скончана

ЛЮБАНЬ. Ня гледзячы на тое, што тэрміны ўборкі бульбы ўжо прайшлі, па Любаньскім раёне яшчэ ня ўбрана больш паловы ўсёй пасеўнай плошчы. Так, на 5 кастрычніка замест 1.454 га ў калгасах убрана 607 га. Па аднаасобным сэктары, замест 3.773 га, убрана 796 га.

У паасобных калгасах тэмпы яшчэ ніжай. Так, у калгасе **«Вызваленьне»** пры наяўнасьці пасеву бульбы ў 13 га, убрана пакуль што 1 га, па калгасе **«Серп і молат»** адпаведна — 20 га, убрана 3 га. **«Чырвоны Аса вец»** — з 15 га, убрана 2 га і г. д.

Яшчэ горш праходзіць у калгасах барацьба са стратамі. Так, па калгасах **«Чырвоная зорка» і «Серп і молат»** пасьля першай уборкі ў зямлі застаецца шмат бульбы. Выбраная бульба ляжыць у кучах па 40-50 тон па некалькі дзён, не пакрытай і яе мочыць дождж.

Між тым, вясковыя арганізацыі не праводзяць адпаведнай масавай работы па ўзмацненьні тэмпаў уборкі і якасьці работы. Задача раённых арганізацый — неадкладна ліквідаваць усе гэтыя ганебныя факты. Вінаватыя ў безгаспадарчых адносінах і псаваньні бульбы павінны быць прыцягнуты да адказнасьці. **Т. Вяроўка.**

Райспажыўсаюз—у баку ад загатовак

ШКЛОЎ. (Наш кар.). Адгрузка бульбы Ленінграду па раёне пад пагрозай. Верасьнёўскі плян адгрузкі—2.830 тон выканан толькі на 21,2 проц.—адгружана 593 тоны.

Апарат ЛОПО, на чале з **Рудзергам,** не мабілізаваўся на пасьпяховае выкананьне пляну. Першая пяцідзёўка кастрычніка не дала зруху. Плян выканан усяго на 23 проц.

Райспажыўсаюз, на чале з тав. **Ялоза,** зусім зьняў з сябе адказнасьць за выкананьне цэнтралізаванага пляну загатовак бульбы. Ніякай дапамогі адгрузцы ён не аказвае і ўвесь час стаіць у баку ад загатовак.

Сельсаветы Сьліжаўскі, Нова-Братчынскі, Загаранскі, Чарнаруцкі, Княжыцкі і інш. не здалі ніводнага кілё бульбы. Цьвёрдыя заданьні імі ня выкананы. Старшыні гэтых сельсаветаў—**Когалеў, Рыянтовіч,** сакратары парт'ячэек—**Закушка, Сякацкі, Ермакоў** і **Крупенка** дзна бязьдзейнічаюць.

З 5 па 15 кастрычніка райком партыі і РВК абвясьцілі па раёну дэкадник штурму па ліквідацыі прарываў па ўсіх відах загатовак. У сельсаветы пасланы ўпаўнаважаныя РК і РВК.

Плян адгрузкі бульбы Ленінграду павінен быць выканан па-баявому.

М. ПАЛОЙЧЫК.

ЗРК „Полымя рэвалюцыі" сарваў уборку

10 верасьня г. г. старшыня праўленьня ЗРК заводу **«Полымя рэвалюцыі»** заключыў дагавор з старшынёй рабачкому саўгасаў «Вязынь-Фаніпаль» і «Няваліч» на вылучэньне 260 рабочых для дапамогі саўгасам ва ўборцы бульбы.

Згодна заключанага дагавору рабочыя ўзялі на сябе абавязак убраць 70 га бульбы, за што яны атрымліваюць, апрача зарплаты, яшчэ 2.000 пудоў бульбы па дзяржаўных цэнах.

Дырэкцыя саўгасаў, будучы ўпэўнена ў рэальнасьці дагавору не клапацілася больш аб наборы рабочай сілы. Былі падрыхтаваны памяшканьні і ўсе неабходныя ўмовы для прыезду рабочых.

Але-ж кіраўнікі заводу «Полымя рэвалюцыі» сарвалі выкананьне дагавору.

У саўгасах чакалі рабочых цэлую пяцідзёўку і так і недачакаліся. У выніку саўгасы апынуліся ў вельмі дрэнным становішчы: рабочых не хапае, вярбоўка сарвана па віне кіраўнікоў заводу, уборка бульбы зацягнулася яшчэ на 10 дзён і да гэтага часу яшчэ ня скончана.

Кантралёр НКЗ — **ПЕРЭЛЬМАН.**

Падцягнуць адсталых на ўзровень перадавых

ЛЕЗНА. На 6 кастрычніка па раёне плян уборкі бульбы выкананы на 62,6 проц. Асабліва адстаюць **Горбаўскі, Стасеўскі і Старабульскі** сельсаветы, дзе плян выкананы менш як на 35 проц.

З усіх сельсаветаў толькі адзін **Лёзьнянскі** 6 кастрычніка скончыў цалкам уборку бульбы. Следам за ім завяршаюць уборку **Кабыліцкі і Беляшкоўскі** сельсаветы.

Адзін з асноўных прычын адставаньня частка сельсаветаў зьяўляецца адсутнасьць масавай работы з боку [illegible] вясковых арганізацый. Вынікам гэтага зьявілася тое, што па **Замшанскім** сельсавеце калгасы пачалі ўборку толькі 1 кастрычніка.

Раённыя арганізацыі [illegible] абавязаны пераключыць [illegible] на ўборку бульбы і падцягнуць [illegible] сельсаветы да ўзроўню перадавых.

(Белта).

У АПОШНЮЮ ХВІЛІНУ

ПРЫВІТАНЬНЕ тав. МОЛАТАВА

КІЧКАС. НАЧАЛЬНІКУ ДНЯПРОЎСКАГА БУДАЎНІЦТВА—ВІНТЭРУ.
САКРАТАРУ РАЙПАРТКОМУ — ЛЕЙБЭНЗОНУ.
СТАРШЫНІ БУДКОМУ — БРОЎКА.

Горача вітаю рабочых, інжынэраў, кіраўнікоў — гераічных будаўнікоў Днепрастанцыі і разам з імі пралетараў і калгаснікаў усёй Савецкай Украіны з выдатнай перамогай сацыялістычнага будаўніцтва, з датэрміновым пускам буйнейшай у сьвеце гідрастанцыі. Ваша работа — прыклад бальшавіцкіх тэмпаў, прыклад таго, як трэба змагацца і перамагаць усе і ўсякія перашкоды і труднасьці на шляху рабочай клясы і працоўных сялян у іх барацьбе за сваё поўнае вызваленьне, за ўздым матар'яльных і культурных умоў жыцьця.

Вашы посьпехі б'юць у лоб нашых клясавых ворагаў і натхняюць змагароў за справу Леніна, за перамогу камунізму, фундамант якога мацнее з кожным днём. Цяпер важнейшай нашай задачай зьяўляецца дабудаваньне ўсяго Дняпроўскага прамысловага камбінату. Будзьце ўпэўнены, таварышы, у тым, што як гэта было ў будаўніцтве Днепрастанцыі, так і цяпер у дабудаваньні Дняпроўскага прамысловага камбінату, вам забясьпечана дружнае і ўсялякае падтрыманьне працоўных усяго Савецкага саюзу.

В. МОЛАТАЎ.

ПРЫВІТАНЬНЕ МК і МГК УсеКП(б) БУДАЎНІКОМ ДНЕПРАБУДУ

ПЯЦЬ СОТНЯЎ ТЫСЯЧ МАСКОЎСКІХ БАЛЬШАВІКОЎ ШЛЮЦЬ ПАЛКАЕ ПРАЛЕТАРСКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ БУДАЎНІКОМ НАЙВЯЛІКШАЙ У СЬВЕЦЕ ДНЯПРОЎСКАЙ ГІДРАЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ. НЕПАХІСНАЕ АЖЫЦЦЯЎЛЕНЬНЕ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ, БЯЗЬЛІТАСНАЙ БАРАЦЬБА З КЛЯСАВЫМІ ВОРАГАМІ ДЫ ІХ АПАРТУНІСТЫЧНЫМІ ДАПАМОЖНІКАМІ ЗАБЯСЬПЕЧЫЛІ НАЙВЯЛІКШЫЯ ПЕРАМОГІ Ў СПРАВЕ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ КРАІНЫ САВЕТАЎ І САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПЕРАРОБКІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ.

ПУСК ДНЯПРОЎСКАЙ ГІДРАСТАНЦЫІ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА БЛІСКУЧЫМ ВЫНІКАМ ГЕРАІЧНАЙ РАБОТЫ ЯЕ БУДАЎНІКОЎ, ЯСКРАВЫМ ДОКАЗАМ НАЙВЯЛІКШАЙ ТВОРЧАЙ МАГУТНАСЬЦІ РАБОЧАЙ КЛЯСЫ НАШАЙ КРАІНЫ І НОВАЙ ГІГАНЦКАЙ ПЕРАМОГІ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ.

НЯХАЙ ЖЫВЕ ЛЕНІНСКІ ЦК!
НЯХАЙ ЖЫВЕ НАШ ПРАВАДЫР І НАСТАЎНІК ТАВ. СТАЛІН!

Сакратар МК і МГК Усе КП(б) **Л. КАГАНОВІЧ.**

Чым недамагае завод „Чырвоны мэталіст“

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Завод «Чырвоны мэталіст» увесь час адстае. Трэці квартал па накрыцьцё запалучаньня ганаровых кварталаў. Праграма выканана ўсяго толькі на 52,59 проц. Замест 500 макухадрабілак, выкананых плянам, выпушчана 345, бульбакапалак — 435 замест 800, балотных плугоў «Збаргард» — 33 замест 50 і корнярэзак замест 500 — 480 шт. Заданьне па выпуску прадукцыі па экспарт выканана на 73,5 проц. Па вырабу запасных частак заданьне выканана на 50,42 проц., цялежак за гэты час ня выпушчана ні адной, у той час, як паводле плану трэба было выпусьціць на суму 2.000 руб.

Адміністрацыя заводу адставаньне апраўдвае недахватам жалеза і матар'ялаў. Але-ж ня ў гэтым галоўнае. Сапраўдныя прычыны саўсім кідаюцца ў вочы: бездападпасьць, безгаспадарчасьць, адсутнасьць увагі ў рабоце кіраўніцтва, замест кіраўніцтва цэхамі — стаўка на самацёк.

Зборачны цэх — гэта барометр заводу. У ім адзяркаляецца апошні працэс—зборка машын. Пры тэй рабочай сіле, якая ёсьць у наяўнасьці, цэх можа ня толькі выконваць, але перавыконваць штодзённыя заданьні, калі б зборшчыка не адрывалі дзесяткі раз у дзень такіцаць аблоўную работу, траціць час па пошуках дэталяй і зусім непатрэбную падгонку іх. Няма такога дня, калі-б зборшчыку падалі і камплекты паўфабрыкатаў з іншых цэхаў.

29 верасьня на зборцы плугу «Збаргард» перабой у рабоце. На зварны затрымаліся задняя колы і да 12 гадзіны ня былі паданы для зборкі. Загатоўчы цэх не забясьпечыў зборачнага дэталямі (упорамі, вагарамі, качалкамі, заднімі восямі). **Паданыя рамы аказаліся бракаванымі, іх прышлося перадаць у загатоўчы цэх для пераапрацоўкі. Непаладкі прывялі да таго, што рабочыя на зборцы плугу «Збаргард» 27 верасьня прастаялі 3,5 гадзіны. Прышлося затрымаць адпраўку зробленых плугоў, якія аказаліся нягоднымі з-за адсутнасьці ключоў.**

Прастої і перабої ў рабоце былі 28 верасьня і на зборцы бульбакапалак. Такарны цэх несвачасова рабіў расточку пазкыльных ролікаў і восяй. Вал быў своечасова абточан, але фрэзэроўка яго зроблена несвачасова. Выробленыя загатоўчым цэхам планкі валькоў-бульбакапалак у колькасьці **1.000 шт. аказаліся бракаванымі.** Балтарэзчыкі саспавалі цры нарэзцы вялікую колькасьць калёў.

У дзень выпуску корнярэзак і сячкарань ўзнават лёгкі цэх. Зборку нельга было скончыць, бо ліцейны не зрабіў рад дэталяй (падзяцёлеяў, бакавін жолабаў, прадахаваўчых шчыткоў і махавікоў). У невыкананьні плянаў па выпуску сячкарань (1 кастрычніка) вінават загатоўчы дрэваапрацоўчага цэху **тав. Завіляеў**, які па патрабаваньні зборачнага цэху аб забясьпечаньні скрынкамі адмовіўся іх выраблянь. Такія выпадкі з боку **Завіляева не ўпяршыню.**

Адміністрацыя зборачнага цэху перакідае частку рабочых на зборку сячкарань са зборкі макухадрабілак, чым зрываецца выпуск апошніх. Паўфабрыкатамі для макухадрабілак завод поўнасьцю забясьпечан.

З прычыны адсутнасьці 28 і 30 мм. жалеза (якое ідзе на выраб всякай плятнай скрынкі і нажыльных ролікаў), у выпуску бульбакапалак былі вялікія перабої і толькі выпадкова майстар такарнага цэху тав. Дарожкін зьвярнуў увагу на тое, што 25 мм. жалеза мае фактычна разьмер 25,6 мм. і яго можна скарыстаць для абточкі выкцэйуказаных дэталяй. Калі-б больш сур'ёзна ўзяцца за скарыстаньне ўнутраных рэсурсаў, выпуск бульбакапалак і іншых машын можна падвоіць.

Сьвідравальныя варштаты не пасьпяваюць сьвідраваць, кавалі не пасьпяваюць каваць балты, — так апраўдваюць прарыў кіраўнікі цэху. У сапраўднасьці-ж справа стаіць зусім ня так. Сьвідравальныя варштаты не пасьпяваюць сьвідраваць таму, што сьвідравальшчык **Аніськін** атрымлівае 5 руб. у дзень, колькі-б ён не працаваў. Хто адбывае падбіўшчыку, даразумела, ня так зацікаўлены у павышэньні прадукцыйнасьці працы. Сьвідравальшчыкі маюць многа начальнікаў і ня ведаюць каму падпарадкавацца. Вось фактыкі. **27 верасьня сьвідравальшчык Драткін, па загаду майстра Яхрэмава пачаў сьвідраваць 5/8 гайкі, не пасьпеў прасьвідраваць 5 гаек, як другі майстар — Аронаў загадаў сьвідраваць крышкі плянэтнай скрынкі, а літаральна праз некалькі хвілін зьявіўся трэці майстар, які даў загад кінуць гэту работу і сьвідраваць дэталі для плугу «Збаргард».**

Па загаду майстра **Яхрэмава**, сьвідравальшчык **Дробаў** выраблянў станіны, потым быў перакінут на сьвідроўку махавікоў, але майстар **Аронаў** да гэтай работы яго не дапусьціў і загадаў стаць на ранейшую працу. Убачыўшы гэта, майстар Яхрэмаў зноў-такі перакінуў тав. Дробава на сьвідроўку махавікоў. У выніку атрымалася, што дэталі былі прасьвідраваны з вялікім спазьненьнем. Гэта выклікала перабої ў зборцы.

Балтоў на заводзе няма. Яны куюцца ўручную, у большасьці выраблянцца крывыя і нягодныя. Пры іх нарэзцы заўсёды псуюцца планкі і ў выніку назбіраецца вялікае затрыманьне ў зборцы машын. Былі дні, калі з-за адсутнасьці балтоў не выпускалася ні адной бульбакапалкі, але і да гэтага часу ніхто ня прыняў мер да зьніжэньня гэтых недахопаў. Прыёмшчык загатоўчага цэху тав. **Рыжынскі** прапанаваў для коўкі балтоў скарыстаць кавальную машыну, якая днямі не скарыстоўваецца. Загадчык вытворчасьці **т. Сяргеенка** даў згоду на скарыстаньне гэтай машыны, але і да сёньняшняга дня нічога ў гэтым напрамку ня зроблена.

Ліцейны цэх ня выконвае сваёй вытворчай праграмы, ён не забясьпечвае такарны і зборачны цэхі патрэбнымі дэталямі. У жніўні цэх меў **1.954 гадзіны прастою.** Канкрэтнымі вінаватымі ў прастоях зьяўляюцца загадчык забясьпячэньня тав. **Шаткар**, загадчык ліцейнага цэху і тэхнічны дырэктар **Харкевіч.**

Заводзкіраўніцтва добра ведае, што з **Мікітаўкі кокс для заводу адгружан 15 верасьня.** Атрымана была тэлеграма, што заход «Адраджэньне» таксама павінен адгрузіць 3 вагоны коксу. Трэба было адразу накіраваць на завод «Адраджэньне» свайго прадстаўніка і атрымаць кокс у Віцебску з тым, каб зьліўка ні ў якім разе ня была спынена. Аднак, да 25 верасьня ват не запыталі ў завода «Адраджэньне» аб прычынах недагрузкі коксу. Гэта ў той час, як 20 верасьня на заводзе ня было ні аднаго кавалку коксу і ліцейны цэх з-за гэтага ня працаваў на працягу 4-х дзён. Толькі **25 верасьня загадчык аддзелу забясьпячэньня т. Ястрэбскі** (які вярнуўся з камандыроўкі), **дастаў у Віцебску 4 тоны коксу. Калі кокс ужо быў прывезен на завод і была патрэбная колькасьць разьлівальшчыкаў, Харкевіч чамусьці даў распараджэньне — «адліўку не праводзіць».** Зноў прастой і вялікія перабої ў рабоце ўсіх цэхаў.

Вельмі часта прастої бываюць у ліцейным цэху з-за незабясьпечанасьці фармоўшчыкаў дапаможнай рабочай сілай. 60 фармоўшчыкаў дапаможнай рабочай сілай. 60 фармоўшчыкаў амаль штодзённа з-за недахвату 2-х рабочых прастойваюць па 20 хв. З-за непадрыхтоўкі пляцу, адсутнасьці запаснога падёмніка ў ліцеі і жніўні налічвалася **427 гадзін прастою.**

Брак у ліцейным расьце. Па фармоўцы корнярэзак ён даходзіць да 6,89 проц., макухадрабілак — 8,91 проц. і бульбакапалак — да 19,32 проц. Рэкорды выпуску браку паказваюць наступныя «ўдарнікі»: **Лазоўскі** — з 11 зафармаваных ім вялікіх пасьцяропак для бульбакапалак зрабіў 10 бракаваных. **Демкін і Бясьсьмертны** з 9 — 7 бракаваных, **Пятрусевіч** з 56 прыцскіх — 36 бракаваных, **Перльштэйн** з 26 накрышак бункага валу — 8 бракаваных.

Ніякай барацьбы з бракаробамі не вядзецца; лепшыя ўдарнікі, якія на-бальшавіцку змагаюцца за ліквідацыю браку, не папулярызуюцца сярод рабочых. **Тав. ШУТАЎ даў брак па сваёй апэрацыі — фармоўка сілясарэзкі — да 2,8 проц. Тав. ДАРКОЎСКІ з зафармаваных 114 сэктарных дыскаў меў толькі адзін бракаваны. ТАЛОЧКА — з 259 нажавых дыскаў — 3 бракаваных. КАМАРОЎ — з 246 махавікоў ня мае ні аднаго бракаванага.**

Прапоўная дысцыпліна на заводзе за апошні час зусім заняпала. Прагулы растуць. У ліпені зволена за прагулы 2 і за адмаўленьне ад работы — 17 чалавек. У жніўні за прагулы зволена 14, за адмаўленьне ад работы — 43 чал. Толькі за жнівень на заводзе налічваецца **322 чалавека-дзён прагулаў**, або 1,4 проц. Вось галярэя злосных прагульшчыкаў — **Лебедзеў Іван** прагуляў больш месяца, **Чарткоў** — 7 дзён, **Матусевіч** — 4 дні, **Іваноў** — 4 дні, **Выменіц** — 4 дні, **Старыкозіч** — 6 дзён, **Роткін** — 11 дзён. Калі да гэтага дадаць 4.374 гадзіны прастояў, якія ёсьць на заводзе, дык будзе зусім ясна, чаму «Чырвоны мэталіст» запыняўся ў бядоцьці прарываў.

Пытальне рацыяналізацыі ігнаруецца. У другім квартале плян рацыяналізацыі быў выканан толькі на 7 проц., правядзеньне ў жыцьцё рацыяналізатарскіх прапаноў было адкладзена на трэці квартал, але і ў трэцім яны таксама ажыцьцёўлены толькі на 50-55 проц. Ад рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў прадугледжана атрымаць умоўна гадавой эканоміі **203.789 руб.**, пакуль атрымана ўсяго 22.399 руб. Усе рацыяналізатарскія мерапрыемствы марынуюцца ў папках мэханіка заводу **Шкубэрта.**

Прапанова тав. **Гаўка** аб прыстасэваньні для каліброўкі транзітных шасьцярэнак да плянэтных скрынак марынуецца ў кабінэце тэхнічнага дырэктара Харкевіча. Каштоўная прапанова тав. **Зрыё** аб клёпцы сьліц на бульбадзёры, што замяняе ручную клёпку, таксама марынуецца ў тэхнічным аддзеле.

Прэміі за прапановы рабочыя атрымліваюць з вялікім спазьненьнем, бо прэміі, якія вызначаны на прэміяваньне, заводзкіраўніцтва скарыстоўвае на іншыя мэты. Масавай работы вакол збору рабочых прапаноў амаль няма ніякай. Партыйная і прафэсыянальная работа на заводзе перабудавана фармальна. Есьць парторгі і групоргі, але масавая работа ў брыгадах, цэхах, вучастках не разгорнута. Вытворчыя нарады праводзяцца рэдка. Ніхто ня сочыць за праверкай выкананьня пастаноў вытворчых нарад. Мабілізацыя рабочых на барацьбу з бракам, прагуламі, прастоямі адсутнічае. Чырвоных і чорных дошак няма. На заводзе налічваецца 700 ударнікаў, але работы з імі ніякай не праводзіцца. Дагаворы па сацспаборніцтву не правяраюцца. **3 225 членаў і кандыдатаў партыі — ударнікаў налічваецца 180 чал.** Праверкі іх работы няма.

На заводзе ёсьць 40 гаспадарча-разрахунковых брыгад, з іх сыстаматычна выконвае прамфінплян толькі адна брыгада па фармоўцы корнярэзак. ІТР заводу ня лічыць сваім абавязкам дапамагаць брыгадам у рабоце. Ня цікавяцца таксама работай гаспадарча-разрахунковых брыгад і цэхавыя прафкамітэты. Улік работы ў брыгадах не наладжан.

Рабочая сталоўка працуе дрэнна. Шмат часу рабочыя траціць на атрыманьне абедзеных талёнаў і ў чарзе за абедамі. У сталоўцы няма паўнейшага ассортыменту. Надлога, сталы заўсёды брудныя. Раскрадваньне прадуктаў абсалютоўваючым пэрсаналам — сыстаматычнае зьявішча. Лепшыя абеды заўсёды атрымліваюць прагульшчыкі, якія раней кідаюць працу. Лепшым-жа ўдарнікам заўсёды застаюцца горшыя абеды.

Завод уступіў у чацьверты квартал, а між тым, пляны да ўсіх рабочых яшчэ не даведзены. На ліквідацыю прарываў рабочыя не мабілізаваны.

Уся заводзкая грамадзкасьць неадкладна павінна быць мабілізавана на ліквідацыю ганебнага адставаньня, на пакрыцьцё вялікай запазычанасьці перад дзяржавай.

Мэталяаб'яднаньне са свайго боку павінна прыняць самыя рашучыя меры да забясьпячэньня заводу сырцом і апалам (кокс), адсутнасьць якога ўносіць вялікія перабої ў работу заводу.

Арк. Зарубежны.

УДАРНІКІ ФІНФРОНТУ БССР МОЦНА ТРЫМАЮЦЬ ПЕРАХОДНЫ СЬЦЯГ НАРКАМФІНУ САЮЗУ

УДАРНІКАМ ФІНАНСАВАГА ФРОНТУ БССР

Пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, пры шырокім удзеле прафсаюзных мас, калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў, — ударнікі фінфронту дабіліся чарговай перамогі на фінансавым фронце — ПЕРАВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ НАСЕЛЬНІЦТВА 3-ГА КВАРТАЛУ.

Вітаю вас і спадзяюся, што ударнікі фінфронту скарыстаюць вопыт гэтай перамогі і бальшавіцкай барацьбой забясьпечаць датэрміновае выкананьне пляну 4-га кварталу апошняга году пяцігодкі.

Старшыня СНК БССР ГАЛАДЗЕД.

БССР выканала фінплян 3-га кварталу

(Гутарка з нам. наркома фінансаў БССР тав. Ляхавым).

(БЕЛТА). Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, па аснове разгортваньня шырокай масавай работы, сацспаборніцтва і ўдарніцтва, БССР выканала фінплян 3-га кварталу на 102,9 проц., а пры ўліку паступленьняў самаабкладаньня—108,8 проц.

Калі ў першым квартале фінплян быў выканан толькі 12-ю раёнамі, галоўным чынам эканамічна моцнымі, дык у другім квартале лік раёнаў, выкананых фінплян, павялічваецца да 21, а ў 3-м—каля 45 раёнаў выканалі і перавыканалі свае заданьні.

Неабходна адзначыць, што ў 3-м квартале некаторыя раёны, якія раней ня выходзілі з паласы прарываў, занялі адно з першых месц. Да такіх раёнаў трэба аднесьці **Рагачоўскі**, які выканаў свой фінплян 3-га кварталу **на 104,3. Лагойскі—117,9, Брагінскі—113.**

Асабліва характэрным у гэтых адносінах зьяўляецца **Рагачоўскі раён**, які па працягу ўсяго часу ня выходзіў з паласы прарываў. Патрабавалася нават спэцыяльная пастанова СНК БССР аб скарачэньні бюджэту Рагачоўскаму раёну па 1932 г. Але варта было пасьля гэтага Рагачоўскаму раёну разгарнуць сапраўды бальшавіцкую барацьбу за фінплян і ён выйшаў у рады перадавых раёнаў. Гэта сьведчыць аб тым, што невыкананьне пляну па іншых раёнах, якія адсталі і зараз яшчэ адстаюць, тлумачыцца адсутнасьцю правільнай арганізацыйна-масавай работы і належнага апэрацыйнага кіраўніцтва справай мабілізацыі сродкаў.

У ліку адстаючых раёнаў ёсьць такія, як **Прапойскі, Асіпавіцкі, Бабруйскі, Клічаўскі, Асьвейскі, Чэрыкаўскі, Церахаўскі, Рэчыцкі, Лоеўскі, Чачэрскі, Бягомльскі, Кармянскі, Глускі, Бярэзінскі і Веткаўскі,** якія выканалі менш 80 проц. квартальнага заданьня.

Зварачае на сябе ўвагу невыкананьне пляну **Бабруйскім** раёнам, які ў папярэдніх кварталах больш умела змагаўся за выкананьне фінпляну, але гэты раён ня здолеў замацаваць дасягнутых вынікаў і настолькі аслабіў масавую работу, што з перадавога раёну апынуўся на адным з апошніх месц, выкананы толькі **74,6** квартальнага

Далейшы аналіз [illegible] паасобнымі раёнамі і на асобных планяжках паказвае, што фінплян, як па рэспубліцы ў цэлым, так і ў раёнах паасобку мог быць ня толькі выканан, але і значна перавыканан. На гэта ў прыватнасьці паказвае рэзультат работы Лепельскага, Дрысенскага і Шклоўскага раёнаў, якія ў першай палове кварталу з прычыны недаацэнкі значэньня арганізацыі масавай работы ў справе выкананьня фінпляну, плялісь ў хвосьце. Але пры належнай увазе фінансавому фронту і разгортваньні масавай работы, яны ня толькі пакрылі прарыў, але і перавыканалі свае пляны.

Чацьверты квартал патрабуе асабліва напружанай работы ўсіх арганізацый на справу выкананьня фінпляну. Гэты квартал зьяўляецца апошнім кварталам першай пяцігодкі, на працягу якога мы павінны стварыць цьвёрдую фінансавую базу для разгортваньня работ, вызначаных плянам другой пяцігодкі.

Рэальнасьць выкананьня плянаў чацьвертага квартала, як і папярэдніх не падлягае ніякаму сумненьню, тым больш, што гэты перыяд зьяўляецца часам найбольшага насычэньня насельніцтва грашовымі сродкамі: расплата на загатоўках, вялікая праграма лесавывазу і распрацовак, расплата па дарожным будаўніцтве, разгортваньне калгаснага гандлю і г. д. Вось чаму ўмовы для выкананьня фінпляну чацьвертага кварталу зьяўляюцца найбольш спрыяючымі.

Работа вакол далейшага выкананьня фінпляну павінна разгортвацца ў форме шырокага аб'ектмасавага паходу, мэта якога—актывізаваць работу ўсіх арганізацый на выкананьне пляну па яго галоўных вучастках: мабілізацыя сродкаў, плацяжы аграмаджанага сэктару, накапленьне грашовых сродкаў калгасаў у касы Дзяржбанку і г. д.

Для кіраўніцтва паходам у кожным раёне арганізуецца апэрацыйная пяцёрка на чале з агітмасам гаркому ці райкому партыі.

НКФ мае весткі аб тым, што некаторыя раёны ўжо пачалі разгортваць работу ў гэтай галіне. У прыватнасьці, **Сіроцінскі** раён, які высунуў лёзунг: **выканаць 50 проц. фінпляну чацьвертага кварталу да дня XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.** Апрача гэтага, у чацьвертым квартале намечана правесьці ўсебеларускі конкурс на лепшую камісію садзейнасьці, на лепшую арганізацыю па выкананьні фінпляну па лініі спажывецкай кааперацыі і Трактарацэнтру і на лепшую газету, рабселькора-ўдарніка фінфронту.

ЦК КП(б)Б—тав. Гікало
СНК БССР—тав. Галадзеду
ЦСПСБ—тав. Кавальчуку

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, дзякуючы разгорнутай масавай працы, пры шырокім удзеле прафсаюзных масы і ўдарнікаў фінансавага фронту, БССР дабілася новай перамогі ПЕРАВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ 3-ГА КВАРТАЛУ (102,9 проц., а пры ўліку паступленьняў самаабкладаньня—108,8 проц.). Гэтай перамогай БССР завяршае гадавіну выкананьня і перавыкананьня фінпляну па мабілізацыі сродкаў насельніцтва.

Звыш 30 раёнаў дабіліся датэрміновага выкананьня і перавыкананьня квартальнага пляну. Сярод іх раёны: ЗАСЛАЎСКІ, ЖЫТКАВІЦКІ, МСЬЦІСЛАЎСКІ, СІРОЦІНСКІ і пралетарскія цэнтры—МЕНСК, ГОМЕЛЬ, ВІЦЕБСК, якія на працягу ўсяго году паказваюць бальшавіцкую барацьбу за фінплян, і з кварталу ў квартал перавыконваюць плян. Разам з тым адзначаюцца раёны: ВЕТКАЎСКІ, БЯРЭЗІНСКІ, ГЛУСКІ, КАРМЯНСКІ, ЛОЕЎСКІ і АСЬВЕЙСКІ, якія сыстэматычна зрываюць выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў.

Запэўняем партыю і ўрад, што не асцярбім барацьбу за мабілізацыю сродкаў на сацыялістычнае будаўніцтва. Пад кіраўніцтвам партыі, пры ўдзеле ўсёй савецкай грамадзкасьці ўступім у другую пяцігодку вялікага сацыялістычнага будаўніцтва з новымі посьпехамі на фінансавым фронце.

Наркамфін БССР — М. АБРАМСОН.

ЦП Саюзу фінбанкаўскіх работнікаў ГЕРАЎКЕР.

У сярэдніх лічбах кварталу намечана скліканьне ўсебеларускага зьлёту калгасьнікаў-ударнікаў фінфронту.

Уся работа ў справе выкананьня фінпляну чацьвертага кварталу павінна ісьці ў асноўным па лініі ўвялкі інтарэсаў дзяржавы з непасрэднымі інтарэсамі працоўных, а адсюль задача—лепшае абслугоўваньне працоўных з боку ўсіх фінансава-крэдытных устаноў.

Неабходна ліквідаваць абязьлічку ў справе скарыстаньня грамадзкіх арганізацый і паасобных актывістаў, г. зн. расставіць сілы так, каб забясьпечыць прымацаваньне паасобных арганізацый і актывістаў да тых вучасткаў, дзе яны змогуць быць скарыстаны з найбольшай карысьцю для справы.

ЛЯБАРАТОРЫЯ БЕЛАРУСКАГА ХІМІКА - ТЭХНАЛЕГІЧНАГА ІНСТЫТУТУ

Дабравольскі

ХЭМІЧНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ БССР У ДРУГОЙ ПЯЦІГОДЦЫ

«Па хэмічнай прамысловасьці поўнасьцю ліквідаваць адставаньне ад тэмпаў разьвіцьця народнай гаспадаркі ў цэлым».

(З рэзал. XVII канф. УсеКП(б).

Пабудова бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва магчыма толькі на базе разгорнутай тэхнічнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі» (XVII партканф.).

Стварэньне новай тэхнічнай базы ня можа быць без такога рэвалюцыянізуючага фактару, як хэмізацыя народнай гаспадаркі, без мацнейшага разьвіцьця хэміі, як аднаго з асноўных мэтадаў навейшай тэхналёгіі.

«На падставе разьвіцьця хэмічнай прамысловасьці ўсяго Саюзу ССР і БССР, у другім пяцігодзьдзі павінна шырока разьвіцца хэмізацыя ўсёй народнай гаспадаркі БССР, як адзін з асноўных элемэнтаў тэхнічнай рэканструкцыі».

І далей, паказваючы шляхі хэмічнага разьвіцьця БССР, СНК і ЦК КП(б)Б у сваіх пастановах даюць канкрэтную ўстаноўку аб базе, на якой павінна разгортвацца хэмічная прамысловасьць. **«Па хэмічнай прамысловасьці забясьпечыць максымальнае разгортваньне на базе комплекснага скарыстаньня багатых сырцовых рэсурсаў у БССР** торфа-хэміі, (перапрацоўка тарфяной смалы, скарыстаньне побочных прадуктаў, лесахэміі (канфольна-мыльна-экстракцыйныя заводы і інш.), біяхэміі, ацэтона-буцілавая вытворчасьць і інш., тукавая прамысловасьць, лякафарбавая, вытворчасьць плястычных мас і г. д. Асабліва павінна быць разгорнута пытаньне аб рэсурсах і комплексным скарыстаньні сапрапэлевых накладаў».

Такім чынам мы бачым, што перад хэмічнай прамысловасьцю БССР у другім пяцігодзьдзі ставяць вялізарныя задачы. Трэба адзначыць, што хэмічная прамысловасьць у БССР пачала толькі разьвівацца ў апошнія гады. У дзяваснай Беларусі ўдзельная вага ў хэмічнай прамысловасьці складала ў агульна-прамысловай вытворчасьці ўсяго каля 1 проц. і ў большасьці насіла саматужны характар.

Імпэрыялістычная, а потым грамадзянская вайна зруйнавалі і тую невялікую хэмічную прамысловасьць, якая існавала раней. Адбудоўчы працэс вельмі малу закрануў хэмічную прамысловасьць, у якой амаль ня было чаго адбудоўваць, а трэба было будаваць занава і да моманту складаньня першай пяцігодкі ўдзельная вага хэмічнай прамысловасьці ледзь дасягала **0,8 пр.ц.,** пры гэтым амаль цалкам захаваўся паўсаматужны характар прадпрыемстваў: **завод «Чырвоны хэмік» (у Нова-Беліцы) з 75 рабочымі, «Фарбацьвет»** (у Лоеве) **з 20 рабочымі, лякапалітурны завод з 10 рабочымі** і г. д. Першы пяцігадовы план намеціў некаторы зрух у разьвіцьці хэмічнай прамысловасьці, але гэты плян далёка ня поўнасьцю быў выкананы і, ня гледзячы на тое, што ў першым пяцігодзьдзі мы пабудавалі такія новыя (маларныя) вытворчасьці, як штучны пюўк, ацэтона-буцілавая, серавугляродная і т. д., шырока разьвілі леса-хэмічную вытворчасьць, — мы ўсё яшчэ значна адстаем у хэмічнай прамысловасьці ад агульных тэмпаў разьвіцьця народнай гаспадаркі.

Таму дырэктыва XVII партканфэрэнцыі УсеКП(б) па хэмічнай прамысловасьці **«поўнасьцю ліквідаваць адставаньне ад тэмпаў разьвіцьця народнай гаспадаркі ў цэлым»** ставіць асабліва вялікія задачы ў БССР.

Як-же ўсе гэтыя дырэктывы камуністычнай партыі і савецкага ўраду адбіваюцца ў пяцігадовым пляне хэмічнай прамысловасьці БССР на 1933—37 г.?

«Цэнтральнай задачай другой пяцігодкі павінна стаць рашучае паляпшэньне ўраджайнасьці калгасных і саўгасных палёў» (XVII партканф.).

Паколькі ў праблеме ўраджаю значнае месца займае пытаньне хэмічных угнаеньняў, **асноўным стрыжнем пяцігадовага пляну хэмічнай прамысловасьці зьяўляецца тукавая вытворчасьць.**

Патрэбнасьць сельскай гаспадаркі БССР у мінэральных угнаеньнях на апошні год другой пяцігодкі вызначаецца **ў 130 тыс.** тон фасфарытнай мукі, **265 тыс.** тон фосфару, **45 тыс.** тон азоту, **130 тыс.** тон калія.

Праблема калія ня можа быць вырашана ў БССР на базе ўласнай вытворчасьці, бо сыравіна — глаўкалітавыя пяскі ўтрымліваюць нязначную колькасьць калія (каля 4 проц.), а да гэтага часу яшчэ ня знойдзены шляхі рэнтабэльнай іх пераапрацоўкі. Але мы маем у СССР такія крыніцы, як Салікамскія (на Урале), якія набываюць сусьветнае значэньне і якія павінны цалкам забясьпечыць каліям патрэбнасьць усяго Саюзу ССР.

Што датычыць фосфару, дык мы маем значныя сырцовыя рэсурсы ў вышнявіне р. Сож. На гэтай базе ў другім пяцігодзьдзі мяркуецца пабудаваць магутны **фасфарытны завод на 100 тыс. тон, прэцыпітатны завод на 40 тыс. тон і амафосны завод на 60 тыс. тон,** які сумесна з фосфарам адначасова дасьць азот. Акрамя таго, 5,5 тыс. тон касьцяной мукі будзе атрымлівацца ад косьцеапрацоўчага заводу.

Фасфарытны завод, які ўжо будуецца, і існуючы завод у Крычаве цалкам забясьпечаць патрэбнасьць сельскай гаспадаркі БССР у фасфарытнай муцэ. Па расчыненых фасфарытах мы будзем мець здавальненьне патрэбнасьці толькі ў размеры каля 22-23 проц. і астатнюю частку прыдзецца завозіць з іншых раёнаў СССР.

Лепш за ўсё вырашаецца праблема азоту, вытворчасьць якога ў асноўным будзе базавацца на асноўным багацьці БССР — торфе. Мяркуецца ў Прапойску пабудаваць тукавы камбінат, які, акрамя вышэйпаказаных заводаў прэцыпітатнага-амафоснага, уключыць у сябе сульфат-амоніявы завод на 40 тыс. тон, завод аміачнай салетры на 30 тыс. тон і лейна-салетравы на 40 тыс. тон. Усе гэтыя заводы задаволяць патрэбу БССР у зьвязаным азоце, прыкладна, на 60 проц. Акрамя таго, значную колькасьць сульфат-амонія мы будзем атрымліваць ад пераапрацоўкі аміяку, які будзе зьбіраецца пры ачыстцы прадуктаў перагонкі торфагазавых заводаў.

Нарэшце, магутнай крыніцай азотнага ўгнаеньня зьявіцца электра-хэмічная прамысловасьць, дзе на базе карбіткальцыя можа быць пабудавана цыянамедная ўстаноўка на 20-25 тыс. тон, якая сумесна з азотам дае глебе адначасова і вапну, што мае вялізарнае значэньне за ўмовы кіслых падзолістых глеб БССР.

Такім чынам, у сумо мы зможам атрымаць колькасьць азотных тукаў, якія забясьпечаць нашу патрэбнасьць на 75—80 проц.

Другой вядучай ідэяй хэмічнай пяцігодкі БССР зьяўляецца **хэмізацыя апалавых рэсурсаў рэспублікі.**

З аднаго боку, мы маем шпаркае разьвіцьцё торфа-хэмічнай прамысловасьці, якая шляхам газафікацыі торфу вырашае ў асноўным азотна-тукавую праблему, дае высока-калёрыйны газ для прамысловых печаў, для бытавых патрэб і магчыма для энэргетычных установак, дае смалу, з якой атрымліваецца рад каштоўных рэчаў, у тым ліку сыравіну для плястычных мас і г. д.

Акрамя таго, гідроліз торфу дае магчымасьць атрымаць сьпіртытус, кармавыя цукры, фурфурол і інш. Каксаваньне дае высокаякасны кокс і рад побочных прадуктаў, як газ, смала, аміяк, якія шляхам і далейшай пераапрацоўкі даюць рад новых каштоўных фабрыкатаў.

Побач з торфам, у апошні час выступае на сцэну **сапрапэль**, які ў хэмічнай прамысловасьці БССР набывае вялізарнейшае значэньне. Сапрапэлевы завод, які праектуецца па пяцігадоваму пляну на 200 тыс. тон, з далейшым яго папырэньнем па 500 тыс. тон, дасьць акрамя паўкоксу і газу таксама важкае паліва, змазачныя маслы, сыравіну для будаўнічых матар'ялаў і інш.

Гаворачы аб хэмізацыі апалавых рэсурсаў, нельга абыйсьці такога асноўнага багацьця БССР, як лес. Леса-хэмічная прамысловасьць у другім пяцігодзьдзі будзе шпарка разьвівацца. Мы маем тут папырэньне і паглыбленьне падсочнай гаспадаркі, індустрыялізацыю эксплёатацыі рэсурсаў шчвага асмолу, шляхам арганізацыі экстрактва і мылына - канфольных заводаў, пашырэньне апэтамецільнай справы, стварэньне новых відаў вытворчасьці, як гідроліз дрэва, выраб этарных алеяў і інш.

Валавая прадукцыя дзяржаўнай леса-хэмічнай прамысловасьці з 7 млн. руб. у 1932 годзе ўзьнімаецца ў апошнім годзе 2-й пяцігодкі да 30 млн. руб. (па цэнах 26—27 году).

Выкарыстаньне сырцовых рэсурсаў БССР для разгортваньня хэмічнай прамысловасьці ідзе ня толькі па шляху аблагаражваньня апалава-сырцовых багацьцяў, але значная месца ў другой пяцігодзьдзі зойміць мінэральныя выкапні і прадукцыя сельскай гаспадаркі.

Па мінэральных выкапнях, акрамя паказаных вышэй фасфарытаў, будуць шырока скарыстоўвацца даламіты для разьвіцьця магнэзіяльнай вытворчасьці, вырабу вуглекіслай і жжоннай магнэзіі і тэрмаізаляцыі боентанітавых глін для арганізацыі вырабу абсарбцыйных матар'ялаў фарбавых зямель, крэйды і інш.

На базе прадуктаў і адкідаў сельскай гаспадаркі разьвіваюцца біяхэмічныя віды вытворчасьці, з атрыманьнем раду раствараляльнікаў, як цэтонь, бутанол, этанол, фармалін і інш.

У другой пяцігодцы асаблівая ўвага будзе зьвернута на разьвіцьцё асноўнай хэміі. У БССР будуць будавацца заводы серкавай і азотнай кіслаты, воднай вуглекіслаты і сухога лёду, сера-вугляродны, магнэзіяльных соляй, шчолакаў і г. д.

На базе гідрарэсурсаў мы арганізуем электра-хэмічную вытворчасьць, якая аб'ядная дзьве кіруючыя галіны перадавой тэхнікі — электрычнасьць і хэмію.

Па ляка-фарбавай прамысловасьці замест поўсаматужнага **Лоеўскага заводу** вырастае магутная вытворчасьць — ляка-фарбавы камбінаты ў **Гомелі, Віцебску** і завод тарфяной сажы.

У другім пяцігодзьдзі мы выходзім на шлях стварэньня ў БССР цьвёрдай базы хэмічнай культуры і кладзем грунт шырокага хэмічнага разьвіцьця рэспублікі. Гэта ў далейшым дасьць нам магчымасьць найчыя сілы і шырока пагльбіць хэмізацыю ўсіх галін народнай гаспадаркі.

У другім пяцігодзьдзі ва ўсе галіны хэмічнай прамысловасьці БССР мяркуецца ўкласьці больш 228 млн. руб. і атрымаць на апошні год пяцігодкі прадукцыі на суму **380 млн.** руб. (у цэнах 26—27 г.), гэта значыць, што прадукцыя ўзрастае за пяцігодзьдзе **ў 4—5 раз.** Найбольш значны ўзрост прадукцыі мы маем: па асноўнай хэміі — да **80 млн.** руб., па тукавай прамысловасьці—да **36 млн.** руб., па лесахэміі — да **67** млн. руб., штучнаму валакну — да **58** млн. руб., ляка-фарбавай прамысловасьці — **28 млн.** руб. і г. д.

Лік пастаянных рабочых па дзяржаўнай хэмічнай прамысловасьці з 2,8 тысяч чалавек узрастае да 8,3 тыс. Розьніца ў тэмпе росту прадукцыі і колькасьці рабочай сілы сьведчыць аб вялікім дасягненьні ў галіне прадукцыйнасьці працы. **Хэмічная прамысловасьць з поўсаматужнай пераходзіць на рэйкі буйнай індустрыі, праца ручная замяняецца амаль цалкам працай машыны і высокай інтэнсыўнасьцю хэмічна - тэхналёгічнага працэсу.**

У народнай гаспадарцы БССР хэмічная прамысловасьць значна павялічвае сваю адносную вагу: з 3,5 проц. ад агульнарэспубліканскай прамысловай вытворчасьці ў 1932 г. яна падымаецца да 6 проц., у 1937 годзе. Трэба пры гэтым адзначыць, што і ўся прамысловасьць БССР у другім пяцігодзьдзі павялічвае сваю прадукцыю амаль у 4 разы: з 1,3 млрд. руб. у пачатку пяцігодзьдзя, да 4,775 млрд. руб. (па цэнах 1926 г.) у канцы яе.

Індустрыялізацыя БССР характарызуецца шпаркім тэмпам хэмізацыі народнай гаспадаркі. Пры гэтым, сацыял

Узнагароды работнікам Днепрабуду

МАСКВА, 10. (ТАСС).

Прэзыдыум ЦВК СССР пастанавіў за асабліва выдатныя заслугі ўзнагародзіць кіраўнікоў і асобных работнікаў Днепрабуду ордэнамі Саюзу ССР:

Ордэнамі Леніна:

ВІНТЭРА Аляксандра Васільевіча — начальніка будаўніцтва, арганізатара і кіраўніка будаўніцтва з самага пачатку будоўлі.

МІХАЙЛАВА Васіля Міхайлавіча — першага намесьніка начальніка будаўніцтва.

ВЕГІНЕЕВА Барыса Яўгеньевіча — галоўнага інжынэра гідратэхнічных пабудоў.

РОТЭРТА Паўла Паўлавіча — намесьніка галоўнага інжынэра па грэмадзянскіх пабудовах.

АЛЯКСАНДРАВА Івана Гаўрылавіча, працаўдзельніка над складаньнем генэральнага праекту будаўніцтва Дняпроўскай гідраэлектрычнай станцыі.

КАНДАЛОВА Інакенція Іванавіча — начальніка гідратэхнічнага аддзелу правага берагу.

ВЯСЕЛАГА Георгія Сяргеевіча — начальніка гідратэхнічных работ левага берагу.

СТУМФА Аляксандра Георгіевіча — памочніка начальніка электрамэханічнага аддзелу.

КАРПАВА Міхаіла Міхайлавіча — кіраўніка электра-мэханічнымі работамі.

ІВАНОВА Аляксандра Герасімавіча — мэханіка практыка.

ЖУКАВУ Марыю Васільляву — брыгадзіра жаночай ударнай брыгады бэтоншчыц.

ГАЛОНЕНКА Мікалая Іванавіча — рабочага сьпёсара.

РУБІНА Марка Самойлавіча — інжынэра-ўдарніка, старэйшага вытворцы работ па пабудове плаціны.

ЛАЎКМАНА Паўла Паўлавіча — інжынэра-гідратэхніка, начальніка тэхнічнага аддзелу.

ГРАНДО Яўсея Паўлавіча — начальніка аддзелу эканомікі працы і загадчыка аддзелу кадраў.

ЛЕЙБЭНЗОНА Марка Львовіча — сакратара комітэту УсеКП(б) на Дняпроўскім будаўніцтве.

СОКАЛАВА Аляксандра Гаўрылавіча — былога сакратара Запароскага акруговага і гарадзкога камітэту УсеКП(б).

МАКАРА Яўсея Грыгоравіча — сакратара комітэту УсеКП(б) на Дняпроўскім будаўніцтве ў пэрыяд са сьнежня 1929 г. па люты 1931 г.

ДЗЬМІТРУСЕНКА Афанасія Афінагенава — паравознага машыніста.

ПАПОВА Міхаіла Іванавіча — рабочага брыгадзіра па мантажы турбін і ротэраў.

ЗАХАРАВА Аляксандра Сьцяпанава — рабочага грузчыка, брыгадзіра такелажных работ.

ЗІЛЬБЭРШТЭЙН Шуламі Аронаўну — інжынэра.

БРЭДЫХІНА Міхаіла Фёдаравіча — паравознага машыніста.

БЭЛІКМАХЕР — брыгадзіра бэтоншчыц.

ГАРКУША Даніла Сьцяпановіча — брыгадзіра цесьляроў.

ТАГЕРАВА Закіра — рабочага бэтоншчыка.

БЯЛЯЕВА Дзьмітрыя Іванавіча — крановага машыніста.

ДУМКІНА Пятра Ільліча — рабочага цесьляра.

УРБАНАВА Уладзімера Ільліча — рабочага электрыка.

ПАЛКАРЧУРОВА Рыгора Ермалаевіча — рабочага сьпёсара.

КАРПЕНКА Марка Аляксеевіча — рабочага лесакомбінату.

ДОЛІНА Івана Ільліча — інжынэра электрыка.

КАНСТАНТЫНАВА Міхаіла Мікалаевіча — інжынэра.

МІХЕЕНКА Дзьмітрыя Аляксандравіча — начальніка лесакомбінату.

ІВАТУЛІНА Ізатулу Садыкавіча — інжынэра.

ВЫСОЧЫНА Герасіма Дзьмітрыява — рабочага сьпёсара.

БУРЭЭ Паўла Людвігавіча — крантавога машыніста.

РЫБІНАВА Паўла Пракоп'евіча — рабочага комітэту.

МАРТЫНЭНКА Фэактыста Пятровіча — буравога майстра.

БАТВІНОВА Сямёна Ігнацьевіча — рабочага кляпальшчыка, брыгадзіра кляпальшчыкаў.

ВАРУШУ Елізавету Георгіеўну — работніцу выпуўнку, загадчыцу магазыну ЗРК.

Ордэнам „Чырвонай Зьвязды“:

АРЛОВА Паўла Іванавіча — рабочага вадапаза.

Ордэнамі працоўнага Чырвонага Сьцягу:

МЕЛІСІМАВА Васіля Грыгоравіча — кіраўніка і арганізатара зямельна-стапёвых работ левага берагу.

БРОЎКА Мікалая Максімавіча — старшыню Дняпроўскага райкому саюзу будаўнікоў.

ЮХНІКА Сямёна Данілавіча — рабочага брыгадзіра мантажнікаў.

БОНДАРА Трыфона Антонавіча — паравознага машыніста.

БУРАКІНА Паўла Васільлявіча — рабочага цесьляра.

КРАЎЗЭ Антона Іванавіча — рабочага кацельшчыка.

АРЛОВА Мікалая Васільлевіча — бухгальтара.

ГРЫДУНОВА Аляксандра Ціхонавіча — інжынэра, намесьніка старэйшага вытворцы работ на плаціне.

КАЦВУ Ісака Барысавіча — начальніка аддзелу снабжэньня.

ЕРМАКОВІЧА Генрыха Казіміравіча — начальніка дэпо.

ГУСАКОЎСКАГА Франца Цімафеевіча — рабочага цесьляра.

КРЫКУНОВА Рыгора Ігнацьевіча — рабочага кацельшчыка.

НОСА Івана Архіпавіча — машыніста на экскаватары.

ПІШМІЦКАГА Мар'яна Канстантынавіча — інжынэра мэханіка.

ВАСІЛЬЛЯВА Яўгенія Восіповіча — інжынэра.

ЗАХАРЭЎСКАГА Вячэслава Аляксеевіча — інжынэра будаўніка.

СОРЭХНІНА Валерыя Дзьмітрыявіча — інжынэра.

ГАРЫНА Віталія Пятровіча — інжынэра электрыка.

ШАФАЛОВІЧА Аляксандра Уладзімеравіча — інжынэра гідратэхніка.

СІЗОВА Сяргея Аляксандровіча — дзесятніка-будаўніка.

БАСІНА Андрэя Міхайлавіча — турбіннага майстра.

ФАДЭЕВА Васіля Іванавіча — начальніка работ па жыльбудаўніцтве.

ЛЕПІХАВА Паўлу Мітрафанавіча — інжынэра.

ПІРАНГА Юлія Якаўлевіча — тэхнічнага кіраўніка работ лесакамбінату.

ТЭРЛІЦКАГА Мікалая Васільлевіча — галоўнага доктара мэдыка-санітарнага аддзелу.

За самаадданую барацьбу на будаўніцтве Днепрапятроўскай гідраэлектрастанцыі ўзнагародзіць ДНЕПРАБУДАЎСКУЮ КАМСАМОЛЬСКУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ ОРДЭНАМ ЛЕНІНА.

Аляксандру Георгіевічу ШТУМФУ — мэханіку практыку, які мае 37-гадовы практычны стаж у галіне мэханікі і які даказаў сваёй работай на Дняпроўскім будаўніцтве, на практыцы кіраўніцтва мэнгажом буйнейшымі агрэгатамі, аўладаньне неабходным аб'ёмам ведаў — надаць годнасьць ІНЖЫНЭРА МЭХАНІКА.

За асабліва выдатную работу ўзнагародзіць ОРДЭНАМ ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЬЦЯГУ наступных працуючых на Днепрабудзе чужаземных спэцыялістаў:

К. Л. КУПЭРА — інжынэра, кіраўніка тэхнічнай кансультацыяй.

Спэцыялістаў, запрошаных з ПАЗШ:

ФРАНКА Файфэра — інжынэра.

МЕРФІ — мацёра.

БІНДЭРА — мацёра па зборцы турбін.

ВІНТЭРА — старшага мацёра па зборцы турбін.

ТАМПСОНА ДЖЭМСА — кіраўніка работ па мантажы генэратараў.

Інжынэра Х. Л. КУПЯРА за аказаную ім дапамогу ў арганізацыі будаўніцтва Дняпроўскай гідраэлектрастанцыі і за тэхнічныя кансультацыі ў часе праваядзеньня работ па пабудове станцыі пастаноўлена ўзнагародзіць ГРАМАТАЙ ад прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР.

Пастаноўлена занесьці на ДОШКУ ГОНАРУ Дняпроўскай гідраэлектрычнай станцыі:

ВІНТЭРА, ВЕДЗІНЕЕВА, РОТЭРТА, АЛЯКСАНДРАВА, МІХАЙЛАВА, КУПЕРА, КАНДАЛАВА, ВЯСЕЛАГА, КАРПАВА, ТОЛВІНСКАГА, АРЛОВА, ЖУКАВУ, ГАПОНЕНКА, УРВАНАВА, ДУМЛІНА, БЯЛЯЕВА.

Новы маслазавод Азнафты ў Баку—адзін з пяршынцаў у рэканструкцыі нафтапрамысловасьці



СЛОВА ЗА ПРАКУРАТУРАЙ

Добруская папяровая фабрыка «Герой працы» — прадпрыемства ўсесаюзнага значэньня — з месяца ў месяц, з кварталу ў квартал не выконвае прамфінпляну.

Адпай з прычын нездавальняючай работы фабрыкі зьяўляецца агідна-дрэнная пастаноўка рабочага снабжэньня. У апараце ЗРК зьвілі сабе гнязьдо п'яніцы і спэкулянты, якія дэзарганізавалі справу рабочага забесьпячэньня.

Самаснабжэньне ўвайшло ў «традыцыю» работнікаў ЗРК. Старшыня праўленьня Чарняк прысвоіў сабе за 75 руб. вялікую люстру, неабходную фабрычнай цырульні, а таксама шэйную машыну, прысланую для шавецкай майстэрні фабрыкі. Яго жонка атрымлівала па асабістых запісках мужа муку, дзесяткі кілё цукру і інш. Загадчык фабрычнай крамы Індэльбуг — член бюро ячэйкі ЗРК — спэкуляваў цукеркамі, якія прыбылі для рабочага снабжэньня.

Можна прывесьці яшчэ рад злачынных камбінацый у галіне самаснабжэньня. У іх, папэўна, дэтальна разьбяруцца пракуратура.

У адказ на скаргі рабочых, праўленьні апраўдвалі дрэннае снабжэньне... недахватам пайкоў, труднасьцямі дастаўкі і інш.

Ня гледзячы па набліжэньне зімы, праўленьне ЗРК нічога ня робіць, каб падрыхтаваць хавальні для гароднінны, склепы для бульбы і інш. Загатоўцы ня высланы ў іншыя раёны, дагаворы з калгасамі, саўгасамі не заключаны ў той час, калі пытаньне са снабжэньнем на фабрыцы — адно з самых актуальных.

Крутая парука, якая грунтуецца на сумесных напойках, па сумесных злачынных дзеяньнях, не дае яшчэ магчымасьці адкрыць заслону над [illegible] фактамі рвацтва, спэкуляцыі, самаснабжэньня, незаконнасьці, якія маюць месца ў рабоце ЗРК.

Спынімся на некаторых момантах, якія досыць ярка характарызуюць пастаноўку рабочага снабжэньня на «Герої працы».

Возьмем прыгарадную гаспадарку. Яна знаходзіцца ў вельмі цяжкім становішчы, ні ў якім разе ня зможа даць рабочым патрэбнай колькасьці бульбы і гароднінны. У гаспадарцы з-за недахвату кармоў разбазарана вялікая колькасьць жывёлы. Асеньняя сяўба ідзе надзвычай дрэнна — не хапае рабочай сілы, але ніхто нічога ня робіць, каб завербаваць яе.

Яшчэ горш стаіць справа са сталоўкай. Тут таксама разьвілася безадказнасьць. Сталоўка не видзе ніякай загатоўчай работы — не загатоўлена прадуктаў ні на адну капейку. Сталоўка жыве падачкамі ЗРК, і ні аб чым не клапоціцца. Якасьць абедаў надзвычай дрэнная. Ніхто не зварачае ўвагі на санітарна-гігіяніччае становішча сталоўкі.

Ня спыняюцца кражы. Нядаўна ў групцы былі знойдзены 2 буханкі хлеба, якія хтосьці схаваў. Ніхто ня сочыць за выдачай прадуктаў. Некаторыя афіцыянткі часта ўхітраюцца даваць па 50-75 грам хлеба на абед, замест 150-200.

Кіраўніцтва сталоўкай, у асобе загадчыка Катляровай, старшыні мясцкому Таўкачовай пакрываюць усе агідпасьці. З цынічнай ухмылкай яны тлумачаць рабочым грубасьць эфіцыянтаў тым, што «ўсім ня дагодзіш». Патураючы самаснабжэньню з боку пэрсаналу, кіраўнікі сталовак бяруць усё, што ім патрэбна з буфэту і кухні, часта не запісваючы на свой рахунак. Самакрытыка ў сталоўцы ігнаруецца. Ніхто ня сьмее крытыкаваць, ня сьмее выкрываць тых агідпасьцяй, якія робяцца ў сталоўцы, бо за гэта пагражаюць звальненьнем. Так напрыклад, зволілі бяз усякіх прычын работніцу Сударыкаву — жонку студэнта, а таксама дачку чырвонага партызана — бронь вучэнніцу. Ня гледзячы на прапановы працсэкцыі і аддзелу працы аб аднаўленьні іх на рабоце, яны дагэтуль у сталоўку ня прыняты.

Ня гледзячы на сыгналы «Чырвонай брамамолкі» і скаргі рабочых парткалектыў і фабком ня прымаюць ніякіх мер для аздараўленьня работы ЗРК і сталоўкі.

Трэба прыняць усе захады, кабачысьціць апарат снабжэньня ад шкоднікаў і спэкулянтаў. Пракуратуры і органам КК РСІ трэба як мага хутчэй заняцца гэтай справай.

С. ДЖЭЛЮК.

Загадана і... кропка!

(Ліст калгасьніка)

Наш калгас «Чырвоны араты» (Мазырскага раёну) арганізаваўся яшчэ ў 1925 годзе. Гэты калгас зьяўляецца адпэй з буйнейшых інтэрнацыянальных калектыўных гаспадарак раёну.

Яшчэ ў 1929 годзе на сваім агульным сходзе калгасьнікі «Чырвонага аратага» як яўрэі, так і беларусы, адзадушна прынялі пастанову аб тым, каб выходным днём у калгасе ўстанавіць сераду. Пасьля гэтай пастановы ніякіх зьмен у распарадку тыдня ў калгасе ня было.

Нядаўна прыехаў у калгас адзін з кіруючых работнікаў раёну тав. Кардаш. Но правёўшы ніякай растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў, ён загадаў перанесьці выходны дзень на нядзелю. Калі-ж калгасьнікі пачалі яму пярэчыць, настойваючы на тым, каб выходны дзень, як і раней, быў у сераду, тав. Кардаш многазначна адказаў ім:

— Есьць такі закон і разважць вельмі няма чаго. А хто выступае супроць закону, той сярыне кулаку.

Праўленьне калгасу прымушана было перанесьці выходны дзень на нядзелю. Гэта мерапрыемства паслужыла прычынай узьнікненьня некаторых непаразуменьняў на нацыянальнай глебе сярод адсталай часткі калгасьнікаў.

Калгасьнікі і зараз настойліва патрабуюць скасаваньня гэтай пастановы раённых арганізацый.

Урэйцкі.

АД РЭДАКЦЫІ: Рэдакцыя лічыць, што ўчынак тав. Кардаша нічым не абгрунтаваны і зьяўляецца прыкладам «лявацкага» адміністраваньня.

Аб цяганіне з рабочымі скаргамі ў асобных ЦП саюзаў

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б

1. ЦК канстатуе, што ня гледзячы на шматлікія ўказаньні т. Кагановіча і спэцыяльныя пастановы IX зьезду прафсаюзаў аб тым, што: «Зьезд катэгарычна патрабуе усіх прафарганізацый, пачынаючы з ЦК саюзу і канчаючы цэхавымі камітэтамі, рашучай барацьбы з няўважлівымі і бюракратычнымі адносінамі да скаргаў рабочых, на недахопы ў вытворчасьці, быту, у гаспадарцы, дзяржапараце і г. д.», прафарганізацыі БССР, у прыватнасьці ЦП саюзаў, праўляюць яўную бюракратычную адносіны да рабочых скаргаў. Рад ЦП саюзаў ня толькі не бяруць на сябе ініцыятыву па расьсьледваньні рабочых скаргаў, якія друкуюцца ў газэтах, але праяўляюць яўную цеганіну ў адносінах да скаргаў, што паступаюць непасрэдна ў ЦП. Паводзіны ЦП харчавікоў і друкароў па справе са скаргай рабочага Ляўкова, ЦП швэйнікаў па раду скаргаў рабочых швэйнікаў даюць прыклад недапушчальнай бюракратычнай цеганіны, якая мяжуецца з апартуністычнай пагардлівасьцю да патрэб і запытаньняў мас.

Ні адно ЦП спэцыяльна не абмяркоўвала рабочых скаргаў і не правярала, як рэагуюць фабзаўкомы на рабочыя скаргі, не стварыла добраахвотнага актыву для праверкі рабочых скаргаў.

2. Канстатуючы вышэйпаказаныя факты, ЦК **пастанаўляе:**

а) фракцыям ЦП харчавікоў, друкароў і швэйнікаў паставіць на від. Папярэдзіць фракцыі ўсіх ЦП гар. і райпрафсаветаў, што ЦК будзе прымаць суровыя меры спагнаньня за далейшую цеганіну з рабочымі лістамі і скаргамі.

Лічыць правільным пастанову ЦСПСБ, якая прыкоўвае ўвагу прафорганаў да задач хуткага і сапраўднага разгляду і прасоўваньня рабочых скаргаў і абавязвае ЦСПСБ забясьпечыць сыстэматычную праверку ЦП саюзаў у іх рабоце па разглядзе і прасоўваньні рабочых скаргаў.

б) Прыняць да ведама заяву тав. Кавальчука, што скарга рабочага друкарні імя Сталіна тав. Ляўкова задаволена і ён атрымаў кватару, прадстаўленую жактам.

в) Абавязаць ЦП саюзаў у трохдзённы тэрмін разглядаць рабочыя скаргі, надрукаваныя ў газэтах і паступіўшыя ў ЦП саюзаў. Абавязаць у далейшым ЦП саюзаў сачыць за тым, каб падобныя рабочыя скаргі разглядаліся і вырашаліся не пазьней, як у дзядны тэрмін. Лічыць, як правіла, што найбольш сур'ёзныя рабочыя скаргі і лісты павінны разглядацца на пасяджэньні адпаведных ЦП саюзаў.

г) Абавязаць ЦСПСБ у буйных прамысловых цэнтрах склікаць прафактывы спэцыяльна па пытаньні аб задачах прафарганізацый у адносінах да рабочых скаргаў і лістоў.

д) Прапанаваць ЦСПСБ і ЦП саюзаў у дзядны тэрмін стварыць добраахвотны актыў з рабочых ударнікаў, дапамагаючы разгляду і прасоўваньню рабочых скаргаў і лістоў.

е) Лічыць, што адзэй з асноўных задач ЦП саюзаў павінен зьявіцца кантроль за тым, як фабзаўмясцкомы рэагуюць на пісьмовыя і вусныя рабочыя скаргі.

3. ЦК КП(б)Б зварачае ўвагу камуністаў, работнікаў прафсаюзаў, што разгляд і прасоўваньне рабочых скаргаў зьяўляюцца адным з важнейшых абавязкаў прафарганізацыі, што таму, як камуніст, старшыня заўкому і цэхкому, работнік райс. і гарпрафсавету, работнік ЦП саюзу будуць адносіцца да рабочых скаргаў, партарганізацыі будуць расцэньваць здольнасьць данага камуніста стаяць на чале і па-бальшавіцку кіраваць прафарганізацыяй.

Указаць партарганізацыям і ячэйкам на неабходнасьць сыстэматычна праверяць работу прафсаюзаў па разгляду і прасоўваньні рабочых скаргаў і лістоў, пэрыядычна ставячы даклады фабзаўкомаў і гарпрафсаветаў аб іх дзейнасьці па гэтым важнейшым участку прафработы.

Злачынца Міглякоў і К° заслугоўваюць суровага пакараньня

Ужо ня раз на старонках цэнтральных і раённых газэт пісалася аб тых злачынных дзеяньнях, якія на працягу доўгага часу мелі месца ў саўгасе ІМЯ XVI ПАРТЗЬЕЗДУ з боку асобных кіруючых работнікаў гэтай гасгіганткі. Між тым, ніхто ў раёне не зварочваў на гэта належнай увагі і ня прымаў ніякіх практычных захадаў па зьнішчэньні тых недахопаў, што мелі месца ў саўгасе.

А аддаваць увагу было чаму. Загадчык гаспадаркі саўгасу МІГЛЯКОЎ (ён-жа намесьнік дырэктара) ЗЛАЧЫНА РАЗБАЗАРВАЎ ДЗЯРЖАЎНУЮ МАЕМАСЬЦЬ. Міглякоў прадаў вінакуру Храмлікову, як нягодныя на корм, два вагоны кукурузы, прычым у часе гэтай зьдзелкі сьпісаны фактам, як недахват 10 тон кукурузы. Між тым гэта кукуруза знаходзілася яшчэ ў дарозе і не прыбыла на месца прызначэньня. Для таго-ж, каб утаіць гэта злоўжываньне ў бухгальтэрыі, Міглякоў за пічае на пасаду рахуніавода сваяка СЬЛЯПЦОВА.

Аб дзейнасьці Сьляпцова можна меркаваць па наступных фактах. Калі сьвінару саўгасу выдаецца 100 кгр. вотрубяй для харчаваньня сьвіней, Сьляпцоў у бухгальтэрыі праводзіць ордэр на 1.100 кгр. У рэзультаце такіх «апэрацый», якія праводзіліся пад непасрэдным кіраўніцтвам Міглякова, у саўгасе «не хапала» кармоў, здохла каля 60 проц. сьвінога стада. На справе-ж саўгаскія кармы Міглякоўым прадаваліся, а грошы паступалі ў яго асабістае карыстаньне.

У мэтах паляпшэньня ўмоў для разбазаваньня дзяржаўнай маемасьці, па загаду Міглякова саўгаскі пакгауз будуецца ў дварэ яго бацькі, які, да рэчы, прызначан вартаўніком гэтага будынку. Ужо пры дапамозе этай камбінацыі Міглякову ўдалося прысвоіць звыш 20 тон пшанічных вотрубяй і амаль столькі-ж тон кукурузы.

Шкодная дзейнасьць Міглякова ня спынялася на гэтым. Пры яго, гаспадарчых «стараньнях» у саўгасе згноены сакавітыя кармы, а жывёла харчавалася гнілой сапомай са страх. У бягучым годзе ў саўгасе згноена 82 тоны сіласу, адна тона дражджэй, 3 тоны коранплёдаў і інш. Міглякоў разам са сваім бацькам арганізаваў у сябе «адкормачны пункт», у якім саўгаскімі кармамі адкармліваў сьвіней і прадаваў у сваю карысьць.

СПЭЦВОПРАТКА, ЯКАЯ ПРЫБЫВАЛА ДЛЯ РАБОЧЫХ САЎГАСУ, ТАКСАМА МІГЛЯКОВЫМ РАЗБАЗАРВАЛАСЯ ДЛЯ ЎЛАСНЫХ ПАТРЭБ, А Ў БУХГАЛЬТЭРЫЮ ПА ДАВАЛІСЯ ВЕСТКІ, ШТО ГЭТА СПЭЦВОПРАТКА ВЫДАНА РАБОЧЫМ, У РЭЗУЛЬТАЦЕ ЧАГО З ЗАРАБОТНАЙ ПЛАТЫ АПОШНІХ РАБІЛІСЯ АДПАВЕДНЫЯ ВЫЛІЧЭНЬНІ.

Значныя шкодныя ўчынкі зроблены Міглякоўым і ў справе будаўніцтва сьвінаводчай фэрмы. Сьвінарнікі ў саўгасе пабудаваны так, што ў іх нельга трымаць сьвіней.

Аб усіх гэтых абураючых фактах ведаў ДЫРЭКТАР САЎГАСУ САЛДАЦЕНКА, але чамусьці не аддаваў ім ніякай увагі, ня прымаў мер, каб спыніць шкодніцкую дзейнасьць раскрадвальнікаў грамадзкай уласнасьці. Усе зрывы ў рабоце саўгасу Салдаценка «зьяўна» тлумачыў «гаспадарчымі цяжкасьцямі».

Не падлягае сумненьню, што шайка злачынцаў на чале з Міглякоўым заслугоўвае самага суровага пакараньня. Адначасова павінны атрымаць па заслугах і тыя, хто не заўважваў, ці не хацеў заўважваць тых злачынных фактаў, якія мелі месца ў саўгасе імя XVI партзьезду. Слова і справа за пракурорам і органамі пралетарскага суда.

Г. СІМХОВІЧ.

„Ці-ж так павінны скарыстоўвацца спэцыялісты?“

(Ліст спэцыяліста-зоатэхніка

Арганізацыя буйных сьвінагадоўчых саўгасаў і высока-таварных калгасных сьвінагадоўчых фэрм зьяўляецца адзіным правільным шляхам для вырашэньня мясной праблемы. Партыяй і ўрадам за апошнія гады ўжо нмат зроблена для стварэньня буйных сьвінагадоўчых гаспадарак. Ня гледзячы на гэта, ёсьць яшчэ арганізацыі, якія не разумеюць значэньня сьвінагадоўлі.

Я працую зоатэхнікам пры Барысаўскай раённай канторы Сьвінаводкалгассаюзу. Маім зоатэхнічным абслугоўваньнем карыстаюцца 48 сьвінагадоўчых фэрм з 2.000 стадам.

За першае паўгодзьдзе плян здачы таварнай прадукцыі фэрмы Барысаўшчыны выканалі толькі на 40 проц. Арганізацыя працы ў большасьці фэрм не наладжана. Зоатэхнімум яшчэ ня ўсюды праводзіцца. У выніку — адыход парасят дасягае 32 і лішнім процантаў. Лічбы гавораць аб ганебным адставаньні.

Што-ж я, раённы зоатэхнік, раблю для зьнішчэньня гэтых лічбаў і разьвіцця сьвінагадоўлі?

Пачну з вясны гэтага году. З сакавіка я быў мабілізован на складаньне вытворча-фінансавых пляноў па калгасах. На гэтай рабоце я прапрацаваў 42 дні. Прыбыўшы ў сельсавету, я быў мабілізован на правядзеньне курсаў брыгадзіраў па пасеўнай кампаніі. Гэта патрабавала 7 дзён. З 28-га красавіка мне прымушалі брыгадзіраў да калгасу на ўсю веснавую пасеўную кампанію бяз права адлучкі. Між іншым за тое, што я адлучыўся з калгасу для адгрузкі кукурузы і разьмеркаваньня яе паміж фэрмамі я атрымаў суровую вымову. У калгасе я прапрацаваў да 15 чэрвеня, пасьля чаго быў накіраваны райкалгассаюзам на мабілізацыю сродкаў і правядзеньне пашкіні на пасыку. Увесь час уборкі я быў прыкцэплены да Жартайскага сельсавету.

Я пытаю, як можна правільна арганізаваць калгасную сьвінагадоўлю пры такім «скарыстаньні» спэцыялістаў і сыстэматычным адрыве іх ад непасрэднай вытворчай работы?

Я зварачаюся да ўсіх зоатэхнікаў БССР расказаць на старонках «Зьвязды» пра вопыт і ўмовы сваёй работы.

Зоатэхнік М. ГАВАРНОЎ.

АД РЭДАКЦЫІ: Рэдакцыя лічыць, што пытаньне, узьнятае ў лісьце т. ГАВАРНОЎА, заслугоўвае сур'ёзнай увагі. Адначасова рэдакцыя адзначае, што такое «скарыстаньне» спэцыялістаў, аб якім піша т. Гаварноў, зьяўляецца недапушчальным і шкодным для гаспадаркі.

Н. ГАФТ

ЧАМУ БЫХАЎ У ТЫЛЕ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК

Свачасовае выкананьне пляну збожжазагатовак зьяўляецца адпэй з рашаючых прадпасылак для пасьпяховага ажыцьцяўленьня народна-гаспадарчых плянаў пэрыпай індыцыдкі і падрыхтоўкі да другой. Гэта значэньне збожжазагатовак яшчэ не ўсьвядомлена кіруючымі арганізацыямі Быхаўскага раёну.

Аб апартуністычнай недаацэнцы важнейшай палітычна-гаспадарчай кампаніі сьведчаць нездавальняючыя тэмпы збожжазагатовак па Быхаўшчыне.

З пачатку кампаніі гадавы плян выкананы паводле даных на 1 кастрычніка толькі на 22 проц. Ніжня-Тошчыцкі, Прылесьненскі, Шыжанавіцкі сельсаветы здалі толькі ад 3 до 10 проц. пляну.

У чым тут справа? Можа ёсьць сапраўдны «аб'ектыўны» прычыны, якія перашкаджаюць Быхаўшчыне выйсьці ў рады перадавых? Можа, заданьні празьмерна вялікія, нерэальныя?

Не! Быхаўская партыйная арганізацыя ў гэтым годзе, як ніколі, мае ўсе ўмовы і рэальнасьці для поўнага і свачасовага выкананьня пляну. Вернемся да фактаў, якія красамоўна гавораць аб гэтым. Параўнальна з мінулым годам плян збожжазагатовак па Быхаўскім раёне вымешнім больш як на 100 проц., у той час, як пасеўная плошча значна павялічылася. У Быхаўскім раёне налічваецца 34 сельсавет, з якіх большасьць атрымала зусім мізэрныя заданьні. Напрыклад, 2-гі Грузінаўскі сельсавет павінен здаць толькі 18 тон, Дунайкаўскі — 9, Чачаевіцкі — 20,5 проц.

Калгасы таксама атрымалі некалькі нізкіх заданьняў. Напрыклад, калгас імя Сяйнага сельсавету павінны здаць усяго 0.38 тоны ўсіх відаў збожжа, Чыгірысінскага сельсавету — 0,3, Н. Тошчыцкага сельсавету — 2,6 тоны і г. д. З гэтых прыкладаў відаць, што няма ніякіх падстаў для жыканьня аб труднасьцях, аб нерэальнасьці пляну, няма тых «аб'ектыўных» прычын, якімі часта любяць казыраць некаторыя раённыя работнікі, каб гэтым апраўдаць сваю апартуністычную бязьдзейнасьць.

Між тым, на 1 кастрычніка калгасны сэктар выканаў сваё гадавое заданьне толькі на 30,6 проц., а аднаасобны — на 16,8 проц.

Асноўнай рашаючай прычынай зацяжкі з выкананьнем пляну трэба лічыць адсутнасьць бальшавіцкай барацьбы за збожжа, слабае разгортваньне штодзённай масавай работы. Замест апэрацыйнага канкрэтнага кіраўніцтва загатоўкамі нашае стаўка на самацёк, на чарговасьць кампаній.

Быхаўскі райком КП(б)В да гэтага часу ня здолеў паставіць у цэнтры сваёй работы бальшавіцкую барацьбу за выкананьне і перавыкананьне пляну збожжазагатовак, прыкладаць увагу ўсёй партыйнай арганізацыі да гэтай важнейшай кампаніі.

Праўда, нельга сказаць, што Быхаўскі РК ня выносіў пастаноў аб загатоўках. Пастаноў паконт неабходнасьці «ўзьняць і ўзмацніць тэмпы» ёсьць шмат, але іх выкананьне не правяраецца, канкрэтная работа, давядзеньне гэтых пастаноў да шырокіх мас адсутнічае.

Калгасныя і бяднацка-сераднацкія масы не мабілізаваны вакол баявых задач выкананьня пляну збожжазагатовак.

Упаўнаважаныя РК КП(б)Б у большасьці выпадкаў сядзяць у раённым цэнтры, а калі выязджаюць у сельсаветы, дык толькі на «гастролі», накруцяцца пару дзён і, недабіўшыся нічога канкрэтнага, рэальнага, варочаюцца дамоў.

На бюро РК, якое адбылося 1-га кастрычніка, былі вынесены выморы ўпаўнаважаным Іванову, Цыганкову і Глінскаму, іншым папярэджаны, што ў выпадку далейшай бязьдзейнасьці, яны будуць суровa пакараны. Але далей гэтых вымоў работа ня рушылася.

Няма апэрацыйнага жывога кіраўніцтва з боку райкалгассаюзу і МТС. Гэта асабліва адчуваюць тыя пізавыя арганізацыі, якія знаходзяцца на адлегласьці ў 20-30 клм. ад раённага цэнтру.

Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на патураючыя адносіны да кулацка-заможных гаспадарак у радзе сельсаветаў раёну. Клясавы вораг усімі сіламі і сродкамі імкнецца сарваць і зацягнуць выкананьне цьвёрдых заданьняў. Аднак дагэтуль ён не атрымаў патрэбнага рашучага адпору.

Падчас, можна з упэўненасьцю сьцьвярджаць, што ў паасобных сельсаветах кулацка-заможныя гаспадаркі атрымалі зусім малыя заданьні. Па Быхаўскім раёне налічваецца звыш 700 кулацка-заможных гаспадарак, якія павінны здаць цьвёрдыя заданьні. Плян гэтым гаспадаркам вызначан у 313 тон, што ў сярэднім складае на адну заможна-кулацкую гаспадарку каля 20 пуд. усіх збожжавых культур. Усё-ж, як гледзячы на гэта, цьвёрдазаданьнікі да 1-га кастрычніка здалі толькі 21,3 проц. пляну. Кулацка-заможныя гаспадаркі Н. Тошчыцкага сельсавету павінны здаць звыш 4 тон, а фактычна здалі 78 кгр., Чырвона-Асьвейскага сельсавету — здалі 946 кгр. замест 23 тон. Такіх прыкладаў можна прывесьці шмат. Па Кіськанівіцкім і Чачаевіцкім сельсаветах да 1-га кастрычніка кулацка-заможныя гаспадаркі яшчэ не атрымалі цьвёрдых заданьняў і не здалі ні адпаго кілё збожжа.

Асаблівыя скажэньні дапушчаны ў Калінаўскім сельсавеце, старшынёй якога зьяўляецца член партыі Савіцкі. У гэтым сельсавеце да бяднацка-сераднацкіх двароў даво дзіліся заданьні, без абгаварэньня іх на агульных сходах, паводле пастановы прэзыдыуму сельсавету, за тое кулацка-заможным гаспадаркам цьвёрдыя заданьні зусім ня даны.

Старшыня Калінаўскага сельсавету ў сваёй адносіне Быхаўскаму РВК паведаміў, што цьвёрдазаданьнікаў у сельсавеце няма. Гэта яўная хлусьня. Хіба не зьяўляюцца заможнымі гаспадаркі Кушнярова і Бралава, якія плоцяць падатку па 119 руб. і Мардачова, якая плоціць 90 руб? Былы цьвёрдазаданьнік Мардачоў зараз працуе рахункаводам у сельсавеце і скарыстоўвае службовае становішча для абароны кулацка-заможных гаспадарак, а старшыня сельсавету Савіцкі пляша пад яго дудку. Аб палітычна-масавай рабоце ў гэтым сельсавеце і гаварыць ня прыходзіцца.

Возьмем Таймана́ўскі сельсавет. За апошнія два месяцы ў самы разгар асеньніх кампаній мяняліся 4 старшыні сельсавету. Уся работа даручана сакратару, які нічога не рабіў. Таму па Таймана́ўскім сельсавеце няма ніякага ўліку выкананьня с.-г. кампаній у тым ліку і збожжазагатовак. Таймана́ўскі сельсавет ведае аб хлозе загатовак па сваіх вёсках толькі з вестак Быхаўскага аддзяленьня «Загатзбожжа».

Трэба адзначыць апартуністычную бязьдзейнасьць Быхаўскага раённага пракурора і нарсуда. У свой час пракуратура рэспублікі прапанавала ўсім райпракурорам прыцягнуць да адказнасьці кулакоў і заможнікаў, якія сабатуюць здачу цьвёрдых заданьняў. На гэтую прапанову пракурор Быхаўскага раёну адказаў, што, маё, няма каго прыцягваць да адказнасьці, што ён ужо некалькі раз зварачаўся да ўсіх сельсаветаў, каб прыслалі матар'ял, але ніхто не прысылае, ён сам выяжджаў у сельсаветы і ня змог знайсьці, каго судзіць.

Гэтая заява — яўнае «очковтирательство», якая нічога агульнага ня мае з сапраўдным станавішчам. На Таймана́ўскім сельсавеце, які знаходзіцца ў 12 клм. ад Быхава, цьвёрдыя заданьні атрымалі 36 кулацка-заможных гаспадарак, якія павінны былі здаць 432 кгр. жыта, а здалі 125 кгр.; 112 кгр. ячменю, а здалі 75 кгр.; пшаніцы замест 46 кгр. здана — 0.

Кулак Конаў Якаў пры цьвёрдым заданьні ў 20 пудоў здаў толькі 6. Пятро Быхаў замест 69 пудоў, здаў 9, Дзям'ян Мацыгнаў атрымаў заданьне ў 32 пуды, а адвёз па пункт 7 пуд.

Адказ Быхаўскага пракурора трэба расцэньваць, як нежаданьне выконваць дырэ

„РАЗЗБРАЕНЬНЕ“ ПА-ФРАНЦУСКУ

НОВАЯ ГІГАНЦКАЯ ГАРМАТА НА ВАЕННЫХ МАНЭЎРАХ ВА ФРАНЦЫІ

МАНЭЎРЫ ВАКОЛ ЛЁНДАНСКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ

ЖЭНЭВА, 9. Сёньня шансы лёнданскай канфэрэнцыі зноў узмацніліся. Гэта прыкметна перш за ўсё на настроях жэнэўскіх кулуараў. Сёньня крыху пасмутнелі тыя, хто ўчора радзіўся правалу намеру Макдональда. Наадварот, павесялелі прыхільнікі лёнданскай сустрэчы. Учора рашаючым паказальнікам для лёсу канфэрэнцыі лічылася англа-францускае камюніке, аб адтэрміноўцы даты скліканьня меркаванай канфэрэнцыі.

Сёньня супастаўляюць другія факты, якія маюць месца за апошнія 24 гадзіны — фармальную згоду Італіі, афіцыёзную заяву амэрыканскага дзяржаўнага дэпартаменту і, нарэшце, германскую ноту, перададную ўчора ангельскаму пасольству ў Бэрліне.

Заява дзяржаўнага дэпартаменту ПАЗШ спрыяе памараньням лёнданскага ўраду. Яна абяцае, што ў выпадку, калі другія ўдзельнікі гэтага захочуць, ПАЗШ гатовы будуць прысылаць у Лёндан свайго прадстаўніка, а ня наглядальніка, як меркавалася раней Германскі адказ зьмятчае той папярэдні адказ, якія давалі на Вільгельмштрасэ (вуліца, дзе зьмяшчаецца германскае міністэрства замежных спраў) на працягу апошніх дзён.

Бэрлін ужо ня ставіць ўмовы ў відзе атрыманьня гарантый. Ён толькі выказвае ўпэўненасьць, што пункт гледжаньня, паданы ў германскім мэмарандуме ад 29 жніўня, паслужыць базай для перагавораў у Лёндане. Падобная пазыцыя Германіі затрудняе становішча Францыі. **У даных умовах адносіны Францыі да ангельскай прапановы зьяўляюцца адзінай перашкодай для неадкладнага скліканьня канфэрэнцыі** (голас саюзьнікаў Францыі вялікай удзельнай вагі ня мае). Утрымацца на такой пазыцыі францускай дыплёматыі будзе цяжка. Было-б, аднак, няправільна думаць, што пытаньне аб лёсе лёнданскай канфэрэнцыі можа зараз вырашацца ізалявана ад іншых праблем міжнароднай палітыкі.

У гэтым кантэксьце паездка Нормана Дэвіса ў Парыж і Лёндан набывае асабліва значэньне. У гульню ўведзена, побач з лёнданскай канфэрэнцыяй (франка-германскія супярэчнасьці), уся праблема Далёкага Ўсходу і лёс дакладу Літона. Франка-амэрыканскія перагаворы на тэму аб палітычных кампэнсацыях, англа-амэрыканскія морскія перагаворы, у часе якіх будуць нясумненна рабіцца спробы ўціліць Лёндан да зьмены палітыкі на Далёкім Усходзе ўзамен магчымых уступак па морскіх пытаньнях, — усе гэтыя фактары аказваюць слой уплыў на канчатковае вырашэньне лёсу лёнданскай канфэрэнцыі. Пакуль што ўсё гэта яшчэ знаходзіцца ў руху.

Намёкі ў прамове Эрыё, якую ён зрабіў у Граме аб новых плянах разьбраеньня і бясьпечнасьці, што падрыхтоўваюцца ў Жэнэве, нарэшце, гутаркі аб тым, што француская дэлегацыя выпрапоўвае канструкцыйны плян для канфэрэнцыі па разьбраеньні, — усё гэта зараз апранаецца ў канкрэтную форму. Гэты плян складаецца, згодна паведамленьня агэнцтва Гавас, з наступных частак: 1) заключэньне кансультацыйнага пакту, 2) сыстэма кантролю і санкцыі, 3) інтэрнацыяналізацыя грамадзянскай авіяцыі, 4) абмежаваньне і скарачэньне некаторых узбраеньняў, асабліва агрэсыўных, згодна рэзалюцыі Бэнэша ад 23 ліпеня, 5) уключэньне ў канвэнцыю ваенных артыкулаў Вэрсаля з некаторымі выпраўленьнямі.

Які палітычны сэнс гэтага пляну, у якім каўрад ці ёсьць што-небудзь новае? У момант, калі крушэньне ангельскіх плянаў пасрэдніцтва здавалася нямінучым, француская дыплёматыя відавочна прабавала ўзяць у свае рукі ініцыятыву. Такава першая задача. Другая заключаецца ў тым, каб дабіцца аднаўленьня жэнэўскіх перагавораў бяз Германіі, з мэтай далейшай яе ізаляцыі. Француская дыплёматыя разьлічвае, што калі ў адказ на гэта Германія пачне ўзбройвацца, то тым самым яна сарве канфэрэнцыю па разьбраеньні. Значыцца, віна падае на яе. Калі яна не адважыцца на падобны крок, канфэрэнцыя будзе працаваць. Францыя будзе праўляць зьнешнюю актыўнасьць, а Германія апынецца ў стане ізаляцыі. Калі ўдасца выпрацаваць канвэнцыю па разьбраеньні на асновах, якія прапануюцца Францыяй, Германіі будзе прапанавана яе падпісаць. Падобны подпіс пад канвэнцыяй, якая зноў пацьвярджае ваенны артыкулы Вэрсаля, для Германіі быў би нематчымым. Адмаўленьне Германіі падпісаць канвэнцыю прывядзе да яе зрыву і віна за гэта зноў падзе на Германію.

Такім чынам, француская тактыка прадбачыць усе магчымыя выпадкі і разьлічвае, што ва ўсіх гэтых выпадках Германія павінна быць загнана ў куток.

АНТЫСАВЕЦКІ ВЫПАД АНГЕЛЬСКІХ КАНСЭРВАТАРАЎ

ЛЁНДАН. На канфэрэнцыі кансэрватыўнай партыі ў Блекпуле аднагалосна прынята рэзалюцыя, патрабуючая правядзеньня рэформы палаты лёрдаў да скалчэньня тэрміну паўнамоцтваў парляманту.

Паводле заявы аўтара рэзалюцыі, бюджэт, складзены Споўдэнам, паказвае, што трэцяя частка нацыянальнага даходу выдаткоўваецца на ўплату мясцовых і дзяржаўных падаткаў.

Міністар фінансаў Чэмбэрлен заявіў, што «ўрадам будуць ажыцьцёўлены новыя меры эканоміі і што ён мае намер канвэртаваць іншыя часткі нацыянальнага доўгу, як толькі дазволяць абставіны». Чэмбэрлен выказаў надзею на магчымасьць правядзеньня «эканоміі» і што з боку ўраду робіцца ў гэтых адносінах усё магчымае, прынята большасьцю галасоў.

На заключным пасяджэньні адхілена была прапанова аб тым, каб падаць кансэрватыўнай партыі назву нацыянальнай партыі.

Была прынята рэзалюцыя па фінансавай палітыцы, якая асуджае спробы звароту да залатога стандарту ў бліжэйшай будучыні і заклікае ўрад пачаць перагаворы з доміньёнамі аб стабілізацыі пакупной сілы ўнутрыімпэрскіх грашовых адзінак на базе індэксу гуртовых цэн на тавары.

Прынята рэзалюцыя, якая прадугледжвае стварэньне асобнай цэнтральнай арганізацыі для каардынацыі фінансавай і прамысловай палітыкі, з мэтай спрыяць найбольш мэтазгоднаму з пункту погляду прамысловасьці капіталаўкладаньню. Рэзалюцыя таксама прадугледжвае стварэньне «нацыянальных саветаў» для кожнай прамысловасьці, або для раду галін прамысловасьці.

Лёкер-Лемпсон заявіў, што ўжо час пакласьць канец спробам СССР «ператварыць Англію ў скрыню для адкідаў». Лёкер-Лемпсон патрабаваў увядзеньня ў выпадку неабходнасьці спэцыяльнага падатку на савецкія тавары і спыненьня крэдытаваньня гандлю з СССР.

Рэзалюцыя канфэрэнцыяй была прынята.

ЯПОНЦЫ ЗАНЯЛІ ЖЭХЭ

Кітайскія войскі аказваюць упартае супраціўленьне

ТОКІЁ. 10 (ТАСС). Паводле паведамленьня «Асакі», 8 кастрычніка японскія войскі ў складзе зводнага палка, гарнізону Цзіньчжоў уступілі ў Жэхэ і пасьля працягнутага бою занялі Сань-бай-Цзы (каля Часяну).

Кітайскія войскі адступілі ў горы, аказаўшы ўпартае супраціўленьне японскім войскам.

МУКДЭН, 9 (ТАСС). Паводле паведамленьня афіцыёзу паўднёвай манчжурскай чыгункі «Манчжурыу Дэйлі ньюс», манчжурскі вайсковы міністр маркуе ўключыць у склад манчжурскай арміі адстаўных капралаў і афіцэраў японскай арміі.

МУКДЭН, 9 (ТАСС). У Дайрэн прыбылі 431 японскіх рэзэрвістаў на чале з палкоўнікам Ісікава. Рэзэрвісты накіроўваюцца ў раён Сяньсіня (паўночная Манчжурыя), дзе арганізуюцца «с.-г. калёніі».

ТОКІЁ, 10 (ТАСС). Згодна паведамленьня агэнцтва «Сёмбун Рэнга», парляманцкі дарадца вайсковага міністра выехаў у Манчжурыю з важным даручэньнем Араўкі.

ЦЫЦЫКАР У РУКАХ КІТАЙСКІХ ПАРТЫЗАН

ВАРШАВА, 9. Польская буржуазная прэса, як вядома добра праінфармаваная пра свайго японскага саюзьніка, паведамляе, што **Цыцыкар**, які некалькі дзён таму назад знаходзіўся яшчэ ў руках японскіх акупантаў, **зараз занят партызанскія атрадамі генэрала Ма.** Японцы ўмацоўваюць свае пазыцыі ў раёне Цзіньчжоў, Чанчуня і Харбіну. Генэрал Лі пасьля жорсткіх баёў аддаў раёнам Ціаноў, перарываючы чыгуначныя зносіны паміж Мукдэнам і Цзіньчжоў.

Японскі генштаб для барацьбы супроць партызан высылае новыя вайсковыя часьці.

НОТА МАНЧЖУРЫІ

МУКДЭН. (ТАСС). Міністар замежных спраў манчжурскага ўраду Се Цзэ-шы адправіў міністрам замежных спраў Англіі, ПАЗШ, Францыі, Германіі і Італіі, а таксама генэральнаму сакратару Лігі нацый ноту, у якой указваецца, што камісія Лігі нацый праднамерана ігнаравала факт існаваньня незалежнай Манчжурскай дзяржавы.

«ЗАКЛЮЧЭНЬНІ ДАКЛАДУ, — гаворыцца ў ноце, — ЯКІЯ ПОЎНАСЬЦЮ АДМАЎЛЯЮЦЦА ПРЫЗНАЦЬ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ МАНЧЖУРСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ, АБСАЛЮТНА НЕ АДБІВАЮЦЬ САПРАЎДНЫХ УМОЎ У МАНЧЖУРЫІ. ВІДАВОЧНА, ШТО ЎСЯКАЯ СПРОБА ПЕРАТВАРЫЦЬ У ЖЫЦЬЦЁ ПРАПАНОВЫ, УГРУНТАВАНЫЯ НА ПАДОБНЫХ ЗАКЛЮЧЭНЬНЯХ, ПРЫВЯДУЦЬ ДА ПОЎНАГА ПРАВАЛУ».

Далей у ноце адзначаецца, што апублікаваньне дакладу Літона

«БУДЗЕ, НАТУРАЛЬНА, СТЫМУЛЯВАЦЬ АКТЫЎНАСЬЦЬ НЕЗАКОННЫХ ЭЛЕМЭНТАЎ, ЯКІЯ ДА ГЭТАГА ЧАСУ БУЙСТВУЮЦЬ У НАШАЙ ДЗЯРЖАВЕ. РАЎНЫМ ЧЫНАМ ЯНО БУДЗЕ СТЫМУЛЯВАЦЬ НАКІРАВАНУЮ ДА ПАРУШЭНЬНЯ МІРУ АГІТАЦЫЮ СТАРЫХ МІЛІТАРЫСТАЎ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА ЗА МЕЖАМІ ВЯЛІКАЙ СЬЦЯНЫ І ЯКІЯ ДЗЕЙНІЧАЮЦЬ ПРАЗ БАНДЫТАЎ». «АД ІМЯ СВАЙГО ЎРАДУ, — заканчвае Се Цзэ-шы, — Я НАСТОЙЛІВА ПРАШУ ВАС АДДАЦЬ СУР'ЁЗНУЮ ЎВАГУ ГЭТАМУ СТАНОВІШЧУ».

* * *

ТОКІЁ. (ТАСС). Сёньня сюды прыбыў з Чанчуня старшыня хейлунцзянскага ўраду Цзянь Чжы-юань, які выяжджае 15 кастрычніка ў Жэнэву ў якасьці «асабістага прадстаўніка Пу-І».

У інтэрв'ю Цзянь Чжы-юань указаў, што мэтай яго паездкі зьяўляецца намер «растлумачыць сапраўднае становішча манчжурскай дзяржавы».

ФАШЫСЦКІЯ „ЦУДЫ“

ВАРШАВА, (Уласная інфармацыя). Праглядаючы буржуазную прэсу Польшчы, зьдзіўляешся вялікаму мноству «цудаў» у гэтай краіне. Куды не павярніся, ўсюды... «цуды». Быў «цуд» над Віслай, потым «цуды» на выбарах, а зараз абвешчана чарговы «цуд»—«цуд» з беспрацоўем.

У паведамленьнях прэсы амаль кожны дзень можна прачытаць, што лічба беспрацоўных «значна зьмяншаецца». Аптымізм буржуазнай прэсы зьяўляецца настолькі вялікім, што яна самым сур'ёзным чынам запэўняе, нібы колькасьць беспрацоўных зьмяншаецца адразу на некалькі тысяч чалавек толькі за тыдзень.

Лёгіка гэтых паведамленьняў дыктуе вывад, што пры такім «бязупынным зьмяншэньні» беспрацоўя ў Польшчы, відавочна, зусім не павінна быць беспрацоўных. Сапраўднасьць, як вядома, паказвае зусім адваротнае.

У апошнім нумары ўрадавых «Статыстычных ведамасьцяй» чытаем:

«У сакавіку 1930 г. у Польшчы было 659 тыс. рабочых працуючых і 290 тыс. беспрацоўных. Усяго рабочых налічвалася **949.000.**

У ліпені 1932 г. працуючых рабочых было **471 тыс.** і беспрацоўных **218 тыс.** Разам — **689.000.**

Як бачым з гэтай табліцы, зьменшалася ня толькі лічба занятых рабочых на працягу двух год **на 188 тыс.**, але за гэты час зьменшылася і колькасьць беспрацоўных на **72 тыс. А 260 тыс. рабочых дзесьці, як скрозь зямлю праваліліся.** Сапраўды «цуд», што і гаварыць...

Ашуканства фашысцкіх статыстыкаў, як на далоні. Яшчэ больш яскрава ілюструюць метады «статыстыкі цуду», даныя аб лічбе беспрацоўных сярод работнікаў разумовай працы.

Паводле даных тых-жа ўрадавых «Статыстычных ведамасьцяй», у канцы мая г. г. у Польшчы налічвалася **48.023 беспрацоўных** работнікаў разумовае працы. На працягу чэрвеня прыбыло 5.700 новых беспрацоўных работнікаў разумовае працы. Але за за гэты час з гэтай лічбы атрымала працу **512 чалавек.**

У канцы-ж чэрвеня лічба зарэгістраваных беспрацоўных работнікаў разумовае працы складала **40.007, або на 8016 менш, чым у папярэднім месяцы.** Атрымліваецца цікавая арытмэтыка: **48.023 + 5.700 — 512 — 40.007.**

Орган польскага сацыял-фашызму **«Работнік»** у нумары 310 зазначае, што гата зроблена ў статыстычнай управе не таму, што там дрэнныя машыны для рахаваньня, але таму, што **13.204 працаўнікоў зусім выкрэсьлена са сьпісаў. Гэта толькі на працягу аднаго чэрвеня.** Некваліфікаваных рабочых за гэты час выкрэсьлена **26.000**, і ў іншых галінах працы таксама выкрэсьлена па некалькі тысяч. Наогул у ліпені са сьпісаў беспрацоўных **выкрэсьлена 83.540 рабочых.**

Вось як лёгка «вырашае» праблему беспрацоўя польскі фашызм. Адно слова — выкрэсьлена, і беспрацоўе ліквідавана. І сапраўды вынаходзтва для фашысцкай Польшчы.

Аднак, выкрэсьліваючы дзесяткі тысяч беспрацоўных са сьпісаў беспрацоўных, пазбаўляючы іх жабрацкай дапамогі, фашызм не вырашае праблемы беспрацоўя. **Вялізарная армія беспрацоўных усё больш упарта і бурна штурмуе асноўныя падпоры фашысцкай дыктатуры.**

Ваенныя падрыхтаваньні польскага фашызму

РЫМ. (ТАСС). «Аэле фашыста» ўказвае, што ў Польшчы арганізован рад супроцьгазавых прытулкаў, разьлічаных на вялікую колькасьць людзей. Паліцэйскія і жандары практычна навучаны абыходжаньню з супроцьгазамі і змогуць выконваць сваю службу ва ўмовах газавай атакі. Праведзена вялікая работа з чыгуначным пэрсаналам і ў результаце цягнікі могуць нармальна курсаваць у мясцовасьцях, атручаных газам. У гарадох і вёсках сярод насельніцтва вядзецца растлумачальная работа. Арганізаваны атрады спэцыяльнага назначэньня. Створана арганізацыя «Абарона ад газавай вайны». Газэта падкрэсьлівае шпаркае разьвіцьцё польскай хэмічнай прамысловасьці, што носіць яўна ваенны характар.

Арктычная экспэдыцыя ледаколу «Сибиряков». ЗЬЛЕВА: Першы забіты мядзьведзь.

„Сибиряков“ выканаў заданьне

Старшыня арктычнай камісіі тав. Каменеў атрымаў тэлеграму ад начальніка экспэдыцыі «Сибирякова» тав. **Шмідта** наступнага зьместу:

«1 кастрычніка ў 15 гадз. «Сибиряков» пад ветразямі перасек мэрыдыян мысу Дэжнева. Выйшлі на чыстую ваду Бэрынгавай пратокі. Заданьне выканана. Паўночна-Ўсходні пройдзен за адну навігацыю без пабочнай дапамогі, ня гледзячы на аварыю. У пратоцы на чыстай вадзе спатканы «Уссурийцем», на буксіры якога пойдзем на рамонт».

* * *

Ледакол «Сибиряков» выканаў аспоўнае заданьне: упяршыню ў сьвеце праінаў Паўночна-Ўсходнім праходам усьдж эўрапейскага і азіяцкага ўзьбярэжжаў за адну навігацыю. Да гэтага часу спробы прабіцца Паўночна-Ўсходнім праходам бяз зімоўкі канчаліся няўдачай.

«Сибиряков», як вядома, выйшаў у плаваньне з Архангельску 28 ліпеня пад кіраўніцтвам начальніка экспэдыцыі тав. **О. Ю. Шмідта** і пад камандаваньнем капітана **В. І. Варанава.** На борце ледакола знаходзіцца група вучоных на чале з прафэсарам **Візэ**, представіцелі друку, кіно-аператары.

На дарозе «Сибиряков» зімаваў зімоўкаў на Паўночнай Зямлі, згрузіў аэрасані для калёністаў бухты Тыксі. Навуковы склад экспэдыцыі праравіў рад вельмі каштоўных назіраньняў.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

СССР вышаў на першае месца ў сьвеце па выплаўцы чыгуну

У параўнаньні са становішчам у капіталістычных краінах, посьпехі нашай чорнай мэталюргіі вялізарныя. СССР зараз адзіная ў сьвеце краіна, дзе прадукцыя чорных мэталяў ідзе няўхільна ўверх. У капіталістычных краінах крывая выпрабу чыгуну і сталі ўсё коціцца ўніз. Параўнальна з 1931 годам, выплаўка чыгуну ў Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатах панізілася ў жніўні бягучага году на 55 проц., у Германіі — на 40 проц., у Францыі — на 38 проц.. У ліпені савецкая выплаўка чыгуну стаяла на першым месцы ў Эўропе, адстаючы толькі ад ПАЗШ на 10 проц. У пачатку верасьня ў Злучаных Штатах былі пагашаны яшчэ 4 домны, і зараз там працуюць толькі 42 домны з максымальнай прадукцыйнасьцю ў 16½ тыс. тон у суткі. У нас-ж сярэднясутачная выплаўка ў верасьні перавышае 18 тыс. тон і, такім чынам, СССР заняў у верасьні першае месца ў сьвеце па выплаўцы чыгуну.

Удзельная вага СССР у сусьветнай прадукцыі чыгуну ўзьнялася з 4,5 проц. у 1929 г. да 17 проц. у жніўні 1932 г.

Уступае ў строй першая ў саюзе аўтаматычная электрастанцыя

ТЫФЛІС. У **Зрывані** скончана будаўніцтва другой электрастанцыі на 2.400 кілёват. **Гэта першая ў Саюзе аўтаматычная станцыя**, якая кіруецца на адлегласьці (за 2 кілёмэтры). Мантаж абсталяваньня скончан. Ідзе выпрабаваньне ўстаноўкі.

Урачысты пуск станцыі прызначан на 15 кастрычніка.

Новыя нафтавыя фантаны

БАКУ. На плянцоўцы **Сулу-Тэле** (Хурдалан), Кіраўскага промыслу, з разьведачнай пгшыны ўдарыў магутны нафтавы фантан. Дэбэт надзвычай высокі — каля 3 тыс. тон у суткі.

* * *

3-га кастрычніка ў **Шырану** (Грузія) з буравой № 218 забіў нафтавы фантан, які за 7 хвілін выкінуў на паверхню 25 тон нафты.

У Хібінгорскай тундры адкрыты новыя паклады руды

ЛЕНІНГРАД. У Хібінах, за 15 кілёмэтраў на поўнач ад Монча-Губы, адкрыты вялізарныя нарадженьні магнітнай аномаліі.

Закладзеныя разьведкай канавы паказваюць, што магутнасьць зоны арудненьня даходзіць да 100 мэтраў. Сярэдняе ўтрыманьне жалеза ў рудзе складае каля 40 проц. з асобнымі мясцовымі абагачэньнямі амаль да чыстага магнецыту.

Запасы аномаліі вялізарныя. На адным толькі заходнім вучастку гары Магнетычнай яны дасягаюць прыкладна 30 млн. тон чорнага мэталю.

* * *

У цэнтральнай частцы Хібінскай тундры адкрыта зона сульфідных (сярністых) руд на працягу 10 клм. Знойдзеныя руды значна абагачаны пірытам і пірытам. Ва многіх мясцох зоны выяўлен таксама малібдэн.

Новая электрастанцыя ў Слуцку

СЛУЦАК, 7-X. У Слуцку пушчана новая электрастанцыя на 7 тыс. кілёват. Энэргія станцыі абслугоўваюцца ўсе прадпрыемствы гораду. Горад цалкам забясьпечан сьвятлом.

Уступіў у строй магілеўскі гародніна-сушыльны завод

У Магілеве ўступіў у строй **гародніна-сушыльны завод «Пучэнэлі».** Прадукцыйнасьць заводу будзе складаць у год 10 тыс. тон пераапрацоўкі гародніны і фруктаў.

Рабочыя і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал заводу запэўняюць ЦК КП(б)Б і СНК БССР, што паклаўшы ў аснову работы ўдзістарычных умоў тав. Сталіна, будуць упарта, па-бальшавіцку змагацца за авладаньне тэхналёгічным працэсам вытворчасьці.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“
Сёньня, 11 кастрычніка і штодзённа
ЛІА ДЭ-ПУЦІ ВЕРНЭР КРАЎС ГЕОРГ АЛЕКСАНДР
У ВЫКЛЮЧНЫМ ЗАМЕЖНЫМ ФІЛЬМЕ
РЭЎНАСЬЦЬ
драма ў 6 частках.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ
кіно-хроніка САЮЗКІНО.
Пачатак сэансаў у 6, 7-30, 9, 10-30.
Каса—ад 1 гадз.
ДЗЕЦІ ДА 16 ГОД ЗУСІМ НЕ ДАПУСКАЮЦЦА.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“
Ад 11 кастрычніка
заменны спартыўны прыгодніцкі фільм
АДЗІНАЦЦАЦЬ ЧАРЦЕЙ
Звыш праграмы кіно-хроніка САЮЗКІНО.
ПАЧАТАК СЭАНСАЎ у 6, 7-30, 9 і 10-30.
Дзіцячы сэанс у 2 г. дня.

СПАРТАК
Пач.: 7, 8-20, 9-40, 11. Каса—з 5 г.
Новы заменны фільм
Абшарпаныя ветразі
КІНО-РАМАН у 8 частках.

Б. загадчыку Дукорскага рабфаку
т. Палешчуку
прапануецца зьявіцца
ў НКЗБ да 15-X—32 г.
Просьба да ўсіх т. т. і ўстаноў, якія ведаюць сучаснае месца знаходжаньня тав. ПАЛЕШЧУКА, паведаміць Наркамзем.
НКЗБ.

Даводзіцца да ведама ўсіх установаў і асоб, што
ліквідацыя Белхлебжывёлсаюзу
закончана 5-X—32 г.,
з якога часу ліквідком лічыцца РАСПУШЧАНЫМ.
Ліквідком.

Турскі тэхнікум насеннаводзтва лугавых траў
працягвае набор студэнтаў
на 1-шы курс на 1932-33 навучальны год.
Прыём заяў да 20 кастрычніка.
Прымаюцца асобы з асьвятой у аб'ёме 7-годкі, а для пераростаў, рабочых і калгаснікаў—за 6 груп сямігодкі. Студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй на агульных падставах. Дакументы аб асьвеце, аб узросьце, аб стане здароўя, медычную справку, аб сац. паходжаньні, дзьве фота-карткі і анкету накіроўваць па адрасе: п.-а Гадзіславічы, Рагачоўскага раёну, прыймовай камісіі Турскага насеннаводнага тэхнікуму.
Дырэкцыя.

ТЭРМІНОВА ПАТРЭБНЫ:
1 МЭХАНІК па дрэваапрацоўчых варштатах
3 ВАРШТАТНЫХ да песапільных рам
3 СТРОГАЛЬШЧЫКІ
1 ЗАГ. СЭКТАРУ СНАБЖЭНЬНЯ
Зварачацца: Менск, Ваенбуд пляц Волі № 23.

Пралетары
НАТЭЛА
у гал. ролі Нета ВАЧНА дзэ
Дзённыя дзіцячыя сэансы
Сапраўдныя палаўлічыя

ВЯЧЭРНІ РАБФАК ПРЫ ЭНЭРГЕТЫЧНЫМ ІНСТЫТУЦЕ
(Менск, Універсрсытэцкая, 42-8)
ДАВОДЗІЦЦА, што апошні тэрмін падачы заяў—15 кастрычніка г. г.
Асобы, якія падалі заявы да 12 кастрычніка, праходзяць іспыты 12-X, у 5 гадз. вечара, а тыя, што падалі заявы пасьля 12-X, праходзяць іспыты у 5 гадз. вечара 15 кастрычніка.

У аддзел аб'яў звяртацца па тэлефону № 7-81

Швэйная ф-ка імя „8-га сакавіка“
даводзіць да ведама ўсіх заказчыкаў,
што у інтэрэсах выкананьня да Кастрычніцкіх урачыстасьцяй старых нявыкананых заказаў, а таксама ўжо прынятых заказаў
да 10 кастрычніка,
НЕАБХОДНА ЗЬЯВІЦЦА НА ПРЫЁМАЧНЫЯ ПУНКТЫ ЗАКАЗАЎ
да 17 кастрычніка включна для прымерак.
У выпадку няяўкі заказчыка да ўказанага тэрміну, выкананьне яго заказаў
будзе перанесена да канца IV кварталу г. г.
Дырэкцыя швэйнай ф-кі „8 сакавіка“.

Даводзіцца да ведама ўсіх грамадзян, якія маюць
ТАЛЁНЫ
на права індывідуальнага заказу
АБУТКУ ЦІ ГАТОВАГА АДЗЕНЬНЯ,
ШТО ВЫДАНЫЯ ТАЛЁНЫ
да 1-га кастрычніка
з 17 кастрычніка будуць лічыцца НЕСАПРАЎДНЫМІ.
Хадайніцтва аб працягненьні тэрміну ня будуць прымацца пад увагу.
БЕЛКААПСАЮЗ.

Рэспубліканскай канторы МЯСАЗБЫТ
патрэбны:
1 фінансіст-гал. бухгальтар,
1 бухгальтар,
1 эканаміст-плянавік.
Аплата па згодзе.
Зварачацца: пляц Волі, 7, Белмясапрамтрэст, сэктар кадраў.

ПУБЛІКАЦЫІ аб згубе дакумантаў у газ. „Зьвязда“ НЯ ПРЫМАЮЦЦА

Менск, друкарня «Зьвязды»